

БЕЛАРУСКІЯ ПРЫСМАКІ БЕЗ ЦУКРУ **4**

ЭКСКЛЮЗІЎ «ЗВЯЗДЫ»: НАРОДНЫ КАЛЯНДАР **8–9**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 СТУДЗЕНЯ 2023 г. СУБОТА № 8 (29888)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Таццяна БРАНЦЭВІЧ, намеснік міністра эканомікі:**

*«На прыярытэтныя мэты развіцця грошы ў дзяржавы ёсць. Але наша ключавая задача — іх эфектыўна выкарыстоўваць. І гэта датычыцца не толькі заказчыкаў дзяржпраграм, а ў прынцыпе — усіх. Кожны абавязаны ўважана распараджацца існуючымі рэсурсамі, каб ні адно мерапрыемства і напрамак не засталіся без фінансавання. Са свайго боку Мінэканомікі і міжведамасная камісія гатовы падтрымаць разумны «бюджэтны манеўр» на карысць мерапрыемстваў, якія хутка рэалізоўваюцца, аператыўна акупляюцца і гарантавана даюць добры эканамічны або сацыяльны эфект для рэгіёнаў і галін. Аднак такія дзеянні павінны быць абгрунтаванымі, падмацаванымі дэтальным аналізам вынікаў пераразмеркавання».*

# На Шчадроўку — са звяздой!



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

Вечар перад старым Новым годам нашы продкі называлі Шчодры (Шчадрэц, Шчадроўка) і абавязкова ішлі ў яго калядаваць. Гэта традыцыя захоўваецца ў многіх мясцінах і сёння. Напрыклад, маленькія жыхаркі вёскі Пясочная Буда Гомельскага раёна Мілена ВАСКУН і Соф'я МЕЛЬНІКАВА ўчора збіраліся калядаваць пры поўным парадзе — нават са звяздой, якую ўласнаручна зрабілі з дапамогай школьных настаўнікаў.

## КОРАТКА

- **Памер сямейнага капіталу з 1 студзеня вырас на 15,2 працэнта і склаў Br29 950.**
- Стыпендыі Прэзідэнта Беларусі на 2023 год назначаны 64 аспірантам.
- **Беларускія стралкі заваявалі чатыры ўзнагароды на старце адкрытага Кубка краіны.**
- Мінскі маторны завод за год павялічыў вытворчасць рухавікоў больш як на 11 працэнтаў.
- **Цэны на яйкі і збожжавыя ў ЕС выраслі ў 2022 годзе больш як на 40 працэнтаў.**

ISSN 1990 — 763X

23008

9 771990 763008

Незвычайнае побач

## НА АДЛЕГЛАСЦІ АДНАГО ФІЛЬМА

### Сям'я купіла старую вясковую хату і за паўгода ператварыла яе ў карцінную галерэю

**Мастацкая галерэя ў глухой вёсцы? Удалечыні ад сталіцы?.. Мінчане Артур і Лора ПАЎЛАВЫ, калі чуюць падобныя, поўныя здзіўлення, пытанні, толькі ўсміхаюцца. «А чаму б і не? Мастацтва не мае межаў. Чым больш смелая задума, тым большая верагоднасць, што яна будзе мець поспех, адгукнецца людзям».**



Тое самае крэсла са старой хаты, якое дапамагло пабудаваць галерэю.

### Пра рэпрадукцыю Шышкіна ды адно крэсла

Пачалося ўсё дзевяць гадоў таму. З таго, што Артур і Лора купілі на беразе маляўнічага возера ў маленькай, але вельмі прыгожай вёсцы Чаросава, што пад Лепелем, старую хату. Рамантаваць не было сэнсу. За той час, што будынак стаяў без догляду, бярвенні прагнілі. Таму на яго месцы новыя гаспадары пабудавалі іншы дыхтоўны дом.

СТАР. 5

Актуальна

## АРЭНДА ЖЫЛЛЯ Ў МІНСКУ ПРАЦЯГВАЕ «ПАДАЦЬ»

### Такой максімальнай прапановы старажылы рынку нават не памятаюць



**Вось і завяршыўся складаны, у многіх адносінах незразумелы 2022 год. Дарэчы, у апошнія тыдні снежня курс долара пакрысе папоўз уверх, прымусіўшы здымшчыкаў кватэр зноў хвалявацца. Занепакоіліся і ўласнікі жылля. Бо на рынку арэнды прыватнай нерухомасці своеасаблівы штыль — гэта калі актыўнасць патэнцыяльных кватарантаў набліжаецца да нуля, а колькасць прапаноў працягвае расці. Што было ў канцы мінулага года і што нас чакае ў гэтым? Паспрабуем разабрацца.**

### Колькасць кватэр працягвае павялічвацца

Як адзначаюць аналітыкі рынку нерухомасці, у снежні попыт на арэнду кватэр у Мінску працягнуў падаць і дасягнуў чатырохгадовага мінімуму. Цэны таксама паступова ідуць уніз. Што адбываецца? Папрацуем з лічбамі.

СТАР. 3

# СЛАЎНАЯ ГІСТОРЫЯ, ВЯЛІКІ ПАТЭНЦЫЯЛ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў жыхароў Віцебскай, Гомельскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей з 85-годдзем з дня ўтварэння гэтых рэгіёнаў**

Віцебская вобласць — самы паўночны рэгіён Беларусі — заўсёды славілася прыгажосцю прыроды, унікальнымі помнікамі, рамёствамі і майстрамі, а яшчэ доблесцю і стойкасцю жыхароў у гады ліхалецця, як гэта было ў час Вялікай Айчыннай вайны, адзначыў кіраўнік дзяржавы. «На Віцебшчыне добра ведаюць цану перамогі, умеюць захоўваць народную памяць, традыцыі і вернасць роднай зямлі, — гаворыцца ў віншаванні. — Дзякуючы нястомнай працы многіх пакаленняў развіваецца сельская гаспадарка, асвойваюцца перадавыя тэхналогіі, будуюцца найноўшыя прадпрыемствы, мадэрнізуюцца вытворчасці, ствараецца сучасная сацыяльная інфраструктура. Далёка за межамі Беларусі вядома грандыёзнае свята мастацтва «Славянскі базар у Віцебску», якое, умацоўваючы дружбу паміж народамі, кожны год збірае тысячы яркіх талентаў з усіх куткоў нашай планеты».

У Гомельскай вобласці, падкрэсліў Прэзідэнт, жывуць майстравітыя, працавітыя, мужныя людзі, бясконца адданыя радзіме. «Сваёй упартай стваральнай працай вы ператварылі некалі патрыярхальны сельскі край у індустрыяльны рэгіён з высокай культурай, развітой навукай, медыцынай і адукацыяй. Разам нам удалося адрадзіць частку пацярпелых ад чарнобыльскай аварыі земель і стварыць дастойныя ўмовы для жыцця людзей», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён звярнуў увагу, што Гомельская вобласць — найбуйнейшая ў Беларусі па тэрыторыі, тут багатыя прыродныя і інтэлектуальныя рэсурсы, здабываецца нафта і газ, выпрабляецца цэлюлоза, сельскагаспадарчая тэхніка, рэалізоўваюцца многія перспектыўныя інвестыцыйныя праекты. «Ёсць чым ганарыцца і ёсць што прапанаваць гасцям», — упэўнены Прэзідэнт.

Звяртаючыся да жыхароў Мінскай вобласці, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэты рэгіён называюць сэрцам Беларусі. «Ён валодае вялікім інвестыцыйным і вытворчым патэнцыялам для развіцця, трывала ўтрымліваючы вядучыя пазіцыі ў сельскагаспадарчай вытворчасці, паспяхова развіваючы прамысловасць і рэалізоўваючы запатрабаваныя часам маштабныя праекты, у ліку якіх індустрыяльны парк «Вялікі камень» і Беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя, — гаворыцца ў віншаванні. — Шматгранная культурнае жыццё вобласці. Край славіцца помнікамі архітэктуры, музеямі і яркімі фестывалямі. Міншчына падарыла свету шмат вядомых людзей, сярод якіх светачы беларускай літаратуры, народныя песняры Янка Купала і Якуб Колас».

У віншаванні жыхарам Магілёўскай вобласці кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гісторыя беларускага Прыдняпроўя літаральна саткана з мноства працоўных дасягненняў і ратных перамог, здабытых доблесцю і мужнасцю нашых продкаў. «Сёння ва ўсіх сферах вытворчасці і грамадскага жыцця Магілёўшчыны створаны неабходныя ўмовы для ўстойлівага развіцця эканомікі, павышэння дабрабыту і якасці жыцця людзей, — канстатаваў Прэзідэнт. — У вобласці засяроджаны асноўныя аб'ёмы беларускай вытворчасці хімічных валокнаў, аўтамабільных шын, ліфтаў, цэменту, паступальна развіваюцца жывёлагадоўля і рыбаводства. Агравацыі рэгіёна паспяхова перабудоўваюцца пад новыя патрабаванні, прадыктаваныя часам. Значным дасягненнем мінулага года стала пераадоленне працаўнікамі вёскі мільённага рубяжа па валавым зборы збожжа».

Аляксандр Лукашэнка пажадаў жыхарам абласцей моцнага здароўя, міру і дабрабыту.

Асобы

# НАРОДНЫ ЎРАЧ СТАЎ ВУЧОНЫМ ГОДА НАН БЕЛАРУСІ

**Прэзідыум НАН Беларусі 13 студзеня зацвердзіў вынікі конкурсу «Вучоны года Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — 2022», праведзенага камісіяй экспертаў, і прыняў рашэнне прысвоіць званне «Вучоны года Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — 2022» загадчыку кафедры інфекцыйных захворванняў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктару медыцынскіх навук, члену-карэспандэнту НАН Ігару Карпаву.**



Высокага звання вучоны ўдастоены за значны асабісты ўклад у развіццё навуковых даследаванняў у галіне клінічнай медыцыны, распрацоўку і ўкараненне інавацыйных метадаў дыягностыкі і лячэння інфекцыйных захворванняў, дасягненні ў падрыхтоўцы навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

Ігар Аляксандравіч Карпаў — вядомы вучоны ў галіне вірусных і бактэрыяльных інфекцый. Яго асноўныя навуковыя работы фундаментальнага і прыкладнога характару прысвечаны вывучэнню клінічнай асаблівасцяў актуальных інфекцыйных захворванняў, распрацоўцы і ўкараненню ў практыку новых аптымальных падыходаў пры лячэнні ВІЧ-інфекцыі, хранічнага віруснага гепатыту, грыпу, COVID-19, бактэрыяльнага і віруснага сепсісу, нейраінфекцый.

Пад яго кіраўніцтвам вывучана этыялагічная структура ВІЧ і мадыфікавана этыятропная тэрапія гэтага захворвання, упершыню ў СНД створана сістэма аказання медыцынскай дапамогі пацыентам з ВІЧ-інфекцыяй на базе інфекцыйных стацыянараў. Ім былі атрыманы новыя даныя па структуры нейраінфекцый. Распрацаваны і ўключаны ў нацыянальныя пратаколы прынцыпы этыятропнай тэрапіі бактэрыяльных захворванняў, віруснага і бактэрыяльнага сепсісу, грыпу, COVID-19.

Ігар Карпаў — галоўны пазаштатны інфекцыяніст Міністэрства аховы здароўя. З 2020 года ён з'яўляецца намеснікам кіраўніка Рэспубліканскай міжведамаснай рабочай групы па пераадоленні COVID-19, неаднаразова прадстаўляў навуковыя даклады па актуальных пытаннях дыягностыкі і лячэння пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй і прафілактыкі захворвання.

Ігар Карпаў — аўтар больш як 500 навуковых работ, у тым ліку чатырох манаграфій, дзевяці калектыўных выданняў, 30 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы. Ён падрыхтаваў трох дактароў і дзевяць кандыдатаў навук. Быў навуковым кансультантам трох доктарскіх і навуковым кіраўніком трох кандыдацкіх дысертацый.

Конкурс «Вучоны года Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» заснаваны ў студзені 2018 года. Яго мэта — заахвочванне навукоўцаў з ліку акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў, якія найбольш эфектыўна працуюць у конкурсным годзе, а таксама навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі, якія працуюць у навуковых арганізацыях НАН Беларусі і маюць значныя асабістыя дасягненні ў навукова-даследчай дзейнасці, уносячы важкі ўклад у развіццё навуковай і інавацыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, умацаванне міжнароднага аўтарытэту Акадэміі навук Беларусі, падрыхтоўку кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Заахвочванне для аспірантаў

**Стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на 2023 год назначаны 64 аспірантам, якія выконваюць дысертацыйныя даследаванні па прыярытэтных напрамках навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці ва ўстановах адукацыі і навуковых арганізацыях. Гэта прадугледжана распараджэннем, якое падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Навуковыя дасягненні стыпендыятаў маюць важнае значэнне для грамадства і дзяржавы. Іх паспяховыя распрацоўкі ў галіне тэхнічных, фізіка-матэматычных, хімічных, медыцынскіх, сельскагаспадарчых, эканамічных, педагагічных навук, мастацтвазнаўства, спорту, навук аб Зямлі актуальныя і запатрабаваныя.

Вынікі іх работ укаранёны ў вучэбную і практычную дзейнасць арганізацый прамысловасці, медыцыны, сельскай гаспадаркі, адукацыі. Яны прадстаўлены на рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях, апублікаваны ў навуковых выданнях.

Распараджэнне прынята ў мэтах падтрымкі навуковых распрацовак таленавітых аспірантаў, прыцягнення ў навуку адоранай моладзі, стымулявання падрыхтоўкі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі, развіцця айчынных навуковых школ.

**Раман ГАЛОЎЧАНКА:**

# «РАБОТА З РАСІЙСКІМІ КАЛЕГАМІ ІДЗЕ ПАСТАЯННА НА ЎСІХ УЗРОЎНЯХ»

**Чарговае пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы можа адбыцца ў лютым**

**«Думаю, што мы ў найбліжэйшы час са старшынёй урада Расіі вызначым дату. Па прапанове Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы, хутчэй за ўсё, гэта адбудзецца ў лютым, бліжэй да сярэдзіны месяца, думаю», — сказаў Раман Галоўчанка. Чакаецца, што пасяджэнне пройдзе ў Расійскай Федэрацыі.**

Паводле яго слоў, на абмеркаванне будуць вынесены ўсе пытанні бягучага ўзаемадзеяння, у тым ліку і тыя, якія абмяркоўваліся ў снежні ў ходзе сустрэчы двух прэзідэнтаў. «Па выніках дадзены канкрэтныя даручэнні, мы склалі матрыцу выканання дамоўленасцяў абодвума бакамі. Цяпер службовыя асобы дзяржаўных органаў працуюць ужо над імі. Таму перш за ўсё, напэўна, падвядзём вынікі на саюзным Саўміне — якім чынам адпрацаваны даручэнні прэзідэнтаў, вынікі рэалізацыі першага этапу саюзных праграм. Вычленім тыя пытанні, якія яшчэ не знайшлі свайго вырашэння і, вядома, абмяркуем, як будзем працаваць і над чым у бягучым годзе», — канкрэтызаваў прэм'ер-міністр.

Пры гэтым ён адзначыў, што работа з расійскімі калегамі ідзе пастаянна на ўсіх узроўнях — паміж міністэрствамі, членамі і кіраўнікамі ўрадаў. «Сустрэчы ідуць пастаянна, гэта значыць расійская дэлегацыі знаходзяцца ў Беларусі, беларускія — у Расіі. Вось на наступным тыдні міністэрствы фінансаў будуць працаваць у Расійскай Федэрацыі. Таму ўсё, што датычыцца бягучых пытанняў, яны ў рэжыме анлайн абмяркоўваюць», — дапоўніў Раман Галоўчанка.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Больш за палову бразільцаў лічаць Балсанару адказным за вандалізм яго прыхільнікаў




Каля 55 працэнтаў бразільцаў лічаць, што на былым прэзідэнце Бразіліі Жаіры Балсанару ляжыць адказнасць за беспарадкі, якія яго прыхільнікі ўчынілі ў дзяржаўных будынках сталіцы, паведаміў партал G1. Так, 38 працэнтаў рэспандэнтаў лічаць, што на Балсанару «вялікая адказнасць» за тое, што адбылося, яшчэ 17 працэнтаў — што ён «у некатарай ступені адказны» за дзеянні яго прыхільнікаў. Пры гэтым 39 працэнтаў апытаных заявілі, што экс-прэзідэнт Бразіліі ні пры чым, і яшчэ 6 працэнтаў заўважылі, што не сфарміравалі сваё меркаванне па гэтым пытанні. Сам Балсанару падчас беспарадкаў знаходзіўся ў ЗША — яго раптоўна шпіталізавалі з болямі ў жываце, гэта хранічная праблема экс-прэзідэнта пасля таго, як у верасні 2018 года ён падвергся нападу. Тады яго паранілі нажом у вобласць жывата, і за апошнія гады ён перанёс некалькі аперацый і шпіталізацый у сувязі з той траўмай. Балсанару дыстанцыяваўся ад удзельнікаў беспарадкаў, заявіўшы, што яны «перасеклі рысу».

## Нацразведка ЗША атрымала звыш паўтысячы новых паведамленняў аб НЛА

Больш чым 500 выпадкаў выяўлення неапазнаных лятальных аб'ектаў (НЛА) было зафіксавана на тэрыторыі Злучаных Штатаў са жніўня 2022 года, вынікае са справаздачы офіса дырэктара нацыянальнай разведкі ЗША. Згодна з ім, больш за палову выяўленых з'яў дэманструюць «нічым не адметныя характарыстыкі». 26 з іх былі ахарактарызаваны як беспілотныя лятальныя апараты (БПЛА), 163 ідэнтыфікаваны «як паветраныя шары або аб'екты, падобныя на паветраныя шары». Некалькі іншых паведамленняў былі звязаны з птушкамі, з'явамі надвор'я ці смеццем, якое знаходзіцца ў паветры, такім як пластыкавыя пакеты. Пры гэтым 171 з'ява так і застаецца невытлумачанай урадам ЗША. «Некаторыя з гэтых нехарактэрных БПЛА прадэманстравалі незвычайныя лётныя характарыстыкі або эксплуатацыйныя магчымасці і патрабуюць далейшага аналізу», — адзначаецца ў справаздачы.

## Моцнае забруджванне паветра зарэгістравана ў ста раёнах Тайланда

Допушчальны ўзровень перавышаны ў некалькі разоў. Пра гэта са спасылкай на даныя маніторынгу World's Air Pollution паведаміла ТАСС. Так, у 10 раёнах каралеўства індэкс якасці паветра павысіўся да фіялетавага ўзроўню, што лічыцца вельмі нездаровым. Пры норме 50 пунктаў ён склаў ад 203 да 282. Спецыялісты папярэдзілі аб магчымым негатыўным уплыве на здароўе. Напрыклад, дзецям і людзям з рэспіраторнымі захворваннямі, уключаючы астму, неабходна абмежаваць час знаходжання на адкрытым паветры. А ў іншых 90 абласцях індэкс павышаны да чырвонага ўзроўню (нездаровы), склаўшы ад 151 да 194 пунктаў. Паводле даных World's Air Pollution, краіна знаходзілася на восьмым месцы сярод дзяржаў з самай нізкай якасцю паветра. Тайланду папярэджваюць у гэтым рэйтынгу Кітай, Катар, Бангладэш, Буркіна-Фасо, Індыя, ЦАР і Пакістан. Як паведамляецца, традыцыйна на снежань—красавік прыпадае пік забруджвання паветра ў Бангкоку і суседніх правінцыях. Звычайна ў гэты перыяд няма ветру, таму шкодныя выкіды затрымліваюцца ў атмасферы.

# АРЭНДА ЖЫЛЛЯ Ў МІНСКУ ПРАЦЯГВАЕ «ПАДАЦЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Колькасць свабодных для засялення кватэр у сталіцы працягвае павялічвацца: за ўвесь снежань у базе фігуравала на 1,5 % кватэр больш, чым месяцам раней. Прычым рынак папоўніўся рознымі тыпамі кватэр раўнамерна: аднапакаёвага і трохпакаёвага жылля стала больш на 2 % у абодвух выпадках, двухпакаёвага — на 1,4 %.

Па даных на пачатак студзеня, аб'ём прапаноў на партале realt.by «пераскочыў» 18-тысячную мяжу. Гэта вельмі вялікая лічба для нашага рынку. Напрыклад, у 2019—2020 гадах, «залаты час» для арэндадаўцаў, для доўгатэрміновага здыму жылля было задзейнічана да чатырох тысяч аб'ектаў жылой нерухомасці. За два-тры гады аб'ём прапаноў вырас проста «катастрафічна». Сітуацыя цалкам перавярнулася. Сёння галоўную партыю гуляюць кватаранты. А яны пакуль актыўнічаць на рынку не спяшаюцца.

Ужо традыцыйна ў снежні актыўнасць па пошуку здымнага жылля ў Мінску зніжаецца. 2022 год не быў выключэннем — у параўнанні з лістападам колькасць пошукавых запытаў «зняць кватэру ў сталіцы» скарацілася на 13 %. Бягучы ўзровень попыту на кватэры ў арэнду з'яўляецца мінімальным за апошнія чатыры гады. Першыя дні студзеня на рынку нерухомасці — заўсёды час нявызначанасці. Гэта датычыцца і здымнага жылля.

Арандатары і арэндадаўцы пазіраюць на курсы валют: ці не папоўзе долар уверх і не пачаўся год з фінансавых сюрпрызаў? Таму, як правіла, у першы месяц года мала хто вырашаецца на пераезды.

На думку **начальніка аддзела арэнды жылля найбуйнейшага агенцтва нерухомасці сталіцы Маргарыты ПАЧЫЦКАЙ,** цяпер на рынку глыбокае зацішша. Не толькі першыя дні студзеня, а амаль увесь першы месяц новага года для рынку нерухомасці — несезон. На попыт уплываюць навагоднія святы, а ўласнікі і арандатары знаходзяцца ў падвешаным стане.

Людзі, на жаль, ужо навучаныя тым, што ў пачатку года заўсёды нешта ў фінансавым плане здараецца. Таму ўсе чакаюць. А калі ў выніку ўсё нармальна, то прыкладна ў другой палове студзеня пачынаецца невялікае ажыўленне. Попыт пачынае расці. Маргарыта Пачыцкая адзначае, што пры любым раскладзе актыўнасць у зімовы час ніжэйшая, чым вясной, летам і восенню. Хоць за апошнія гады спецыялісты рынку нерухомасці прыйшлі да высновы, што нейкіх усплёскаў у залежнасці ад сезона ўжо амаль не адбываецца.

Менавіта зімой назіраецца павелічэнне зваротаў у агенцтва з боку ўласнікаў, якія шукаюць новых жыхароў, бо самастойна не могуць здаць у арэнду кватэру. Халодны сезон мала спрыяе пераезду. Нават калі чалавека не задавальняе цяперашняе месца жыхарства і кошт арэнды, усё роўна ён чакае пацяплення, каб пераехаць.

## Выбар цяпер максімальны, а цэны — на мінімуме

Эксперты рынку ўпэўнены, што больш істотныя зрухі на рынку арэнды жылля будуць у сакавіку.



Менавіта тады рынак пачне ажывацца пасля зімовай спячкі, але... Калі хтосьці адважыўся акурат зараз змяніць кватэру, то час цалкам удалы.

Цэны на арэнду цяпер адэкватныя, скачка курсу не адбылося, варыянтаў шмат. Ужо няма такога, што людзі бяруць першую кватэру, таму што баяцца не знайсці жылля наогул. Цяпер з выбарам часовага месца пражывання можна не спяшацца. Лепш прыгледзецца, разгледзець некалькі варыянтаў. Па словах прадстаўнікоў арандатараў, прапаноў на рынку арэнды становіцца больш па некалькіх прычынах. Шмат кватэр прапануецца з ужо «старога» жылога фонду, а да іх пастаянна дадаюцца кватэры з новабудоўляў — той жа «Мінск Мір», дзе ёсць якраз жыллё для кватарантаў: малагабарытныя кватэры, кватэры-студыі, кватэры еўрафармату».

## Аднапакаёвыя кватэры ўжо можна зняць за 160 у. а. і нават за 150

Праўда, пры актуальнай цане штомесячнай арэнды маленькіх кватэр у 150—160 долараў гэта будзе жыллё, дзе рамонт не важны, а размяшчацца такая нерухомасць будзе досыць далёка ад метро. Блізкасць такіх неліквідных кватэр да лініі метро павялічвае стаўку арэнды да 180 долараў. У цэнтры горада такія слабенькія кватэры здаюцца па 200 долараў.

Аднапакаёвыя кватэры ў нармальным стане, але без мэблі, гатовыя здаць кватарантам за 170 долараў. Праўда, будзе такое жыллё на ўскраіне горада. Нармальныя кватэры побач з метро — 190 долараў, у цэнтры горада — 210 долараў.

Невялікія кватэры з якасным рамонтам, але без мэблі, удалечыні ад метро — 180 долараў, побач з метро — 210 долараў, у цэнтры — 230 долараў.

Аднапакаёвыя кватэры з выдатным рамонтам, поўным наборам мэблі і бытавой тэхнікі, удалечыні ад метро здаюцца ў студзені за 200 долараў. Такое жыллё побач з метро — 250 долараў, у цэнтры — 280 долараў.

Двухпакаёвыя кватэры па цане трохі адрозніваюцца ад маленькага жылля, але не прынцыпова. Самыя танныя апартаменты ўдалечыні ад метро здаюцца за 180 долараў, побач з метро — 200 долараў, у цэнтры — 220 долараў. Двухпакаёвае жыллё ў нармальным стане, але без мэблі, удалечыні ад метро можна зняць за 200 долараў. Побач з метро — 220, у цэнтры горада — 250 долараў.

Такія кватэры з выдатным рамонтам і поўным наборам мэблі і бытавой тэхнікі, удалечыні ад метро — 270 долараў, каля метро — 310, у цэнтры горада — 320 долараў.

## У найбліжэйшы сезон прапанова на рынку не паменшыцца

Маргарыта Пачыцкая лічыць, што чакаць таго, што рынак арэнды будзе неяк «усыхаць», не варта. Мінулыя два гады адзначыліся рэкордным папаўненнем прапаноў жылля. Пры гэтым многія арандатары выехалі з нашага рэгіёна, вызваліўшы яшчэ больш плошчаў. Таму рынак цяпер на баку арандатара. Вялікая колькасць варыянтаў, лаяльныя ўласнікі, таму што сярод іх ужо склалася вялікая канкурэнцыя, лічаць аналітыкі.

Яны ўпэўнены, што ў найбліжэйшы год такая сітуацыя захаваецца. Канкурэнцыя сярод уласнікаў будзе ўзмацняцца проста таму, што прытоку арандатараў чакаць няма адкуль, а прыток кватэр будзе нарастаць.

Ёсць яшчэ адзін нюанс — калі можна казаць аб канкурэнцыі ў квадрацые сярод арэндадаўцаў за кошт увядзення вялікай колькасці кватэр у новабудоўлях і з рамонтам. Такія новыя кватэры нават пабудаваны для прыватнай арэнды. Арандатары заўсёды аддаюць перавагу новабудоўлям, таму што ў іх ніхто не жыў. Але там і цана арэнды будзе вышэйшая.

Праўда, не ўсе арандатары гатовыя заплаціць больш за новабудоўлю, ды і не ўсе кватаранты гатовыя мірыцца з пэўным дыскамфортам пры пражыванні ў новых раёнах. У новабудоўлях суседзі рамонт робяць, там не заўсёды развітая інфраструктура, недахоп парковак і шмат іншых часовых нязручнасцяў. Таму сказаць адназначна, што на фоне выхаду новабудоўляў старыя панэлькі і хрушчоўкі будуць прастойваць, таксама не зусім дакладна.

Эксперт рынку арэнды жылля ўсё ж рэкамендуе ўласнікам старога жылога фонду быць больш лаяльнымі да арандатараў. Калі ў гаспадара кватэры даволі часта мяняюцца кватаранты, варта задумацца: можа, прыйшоў час асвяжыць рамонт у кватэры альбо трохі знізіць кошт арэнды. Трэба памятаць, што арандатару спяшацца няма куды.

Маргарыта Пачыцкая прыводзіць прыклад жнівеньскага попыту на арэнду жылля ў Мінску праз прыток студэнтаў. «Часта ад студэнтаў, якія самастойна шукаюць кватэры, можна пачуць, што выбару мала, уласнікі раяць браць ці ледзь не першы варыянт. Дык вось гэта зман. Мы бачым увесь рынак, а таму аб'ектыўна ацэньваем сітуацыю. І кватэр цяпер, кажучы простай мовай, проста цемра: ад 150 долараў і вышэй, на любы густ. Такой колькасці прапаноў у Мінску не было, мабыць, ніколі», — заяўляе эксперт.

## Топ-парады кватарантам-пачаткоўцам

Як правіла, на практыцы рэальна працуюць першыя 3—5 рэкамендацый. Але мы дадзім усе дзесяць.

Пастаянна шукайце сайты нерухомасці. У першую чаргу варта «палазіць» на realt.by, kvartirant.by, onliner.by і kufar.by. Размясціце аб'яву аб пошуку жылля ў сябе ў сацыяльных сетках. Нават калі ў вас 300 падпісчыкаў у Instagram, гэта ўсё роўна працуе. Паспрабуйце ўспомніць пароль ад «Аднакласнікаў» і размясціць пост там. Дарэчы, адна наша чытачка сцвярджае: папяровыя аб'явы таксама працуюць.

Тэлефануйце па старых аб'явах. Нават калі кватэру здалі год таму, ёсць шанц, што жыхары якраз з яе з'язджаюць. Можна пытацца ў знаёмых і аднакурснікаў, ці не плануюць яны вызваляць жыллё.

Трымайце пры сабе суму, неабходную для аплаты першага месяца і ўнясення закладу. Добрыя варыянты размятаюць як гарачыя піражкі. Калі ёсць нейкія непаладкі або паломкі ў кватэры, абавязкова ўказвайце на гэта гаспадарам як мага раней. Агледзьце ў кватэры ўсё да таго, як заязджаць. Аж да палічак у шафе. Звяртайце ўвагу на стан не толькі кватэры, але і гаспадара.

Не саромейцеся задаваць пытанні. Даведайцеся, колькі чалавек у кватэры прапісана, каб потым не прыйшлося аплачваць велізарныя рахункі за «камуналку». Цікаўцеся, хто жыве па суседстве.

Складзіце спіс крытэрыяў, якія важныя для вас пры выбары кватэры: як дабірацца да вучобы/працы, планіроўка, паверх. Звяртайце ўвагу нават на колеравую гаму жылля. Калі вам не вельмі спадабаліся ярка-бардовыя шпалеры ў спальні, то праз месяц яны пачнуць вас раздражняць. Даведайцеся, як аплачваць камунальныя паслугі. Каб потым не аказалася, што вада аплачваецца асобна.

Звязвайцеся з гаспадарамі і едзьце на прагляд кватэры адразу ж, як з'явіцца прыдатны варыянт. Здавалася б, аб'яву размясцілі толькі сёння, а ахвотных зняць жыллё за адэкватныя грошы — ужо цэлая чарга.

Абавязкова заключайце дагавор. Але калі вы ўпусцілі гэты момант і вас раптам вырашылі выселіць — рабіце фота кватэры і вашых рэчаў у ёй. Гэта стане доказам для падатковай, што гаспадар здае жыллё, але не плаціць працэнт дзяржаве.

## Уласніку на заметку

**Павысіўся падатак за здачу жылля ў арэнду.** У нас заўсёды ў пачатку года адбываюцца фінансавыя перамены. Для кагосьці яны радасныя, для кагосьці — не вельмі. Напрыклад, з пачатку студзеня вырасла базавая велічыня (цяпер яна роўная 37 рублям), а разам з ёй памянялася і мінімальная зарплата. З новага года змяніліся некаторыя стаўкі і ў падатковай сферы. Менавіта са студзеня мяняюцца адзін раз на год стаўкі падаткаў, якія неабходна плаціць уласнікам жылля (фізічным асобам), за тое, што яны здаюць свае «метры» ў арэнду.

На нацыянальным прававым партале днямі апублікаваны дакумент № 230-З ад 30 снежня 2022 года «Аб змене законаў па пытаннях падаткаабкладання», на які зараз і варта арыентавацца ўласнікам, якія здаюць у арэнду сваё жыллё.

Згодна з гэтым дакументам, сёлета мінскім арэндадаўцам трэба будзе плаціць падатак за кожны пакой (садовы домік або лецішча) 43,90 рубля ў месяц. У абласных гарадах і Мінскім раёне за арэнду аднаго пакоя гаспадарам кватэры трэба будзе заплаціць 41,20 рубля ў месяц. Падаражанне ставак адбылося прыкладна на 7 рублёў. Летась сталічныя ўласнікі плацілі 36,8 рубля, а ўладальнікі жылля ў абласных цэнтрах — 34,5 рубля за кожны пакой, які здаецца. Выходзіць, што грамадзянін, які здае ў Мінску аднапакаёвую кватэру, заплаціць за цэлы год 526,8 рубля, а калі кватэра двухпакаёвая, то 1053,6 рубля.

Змяніліся і стаўкі падаходнага падатку з фізічных асоб у фіксаваных сумах і ў іншых гарадах і населеных пунктах.

Напрыклад, у такіх гарадах, як Баранавічы, Бабруйск, Барысаў, Ваўкавыск, Горкі, Дзяржынск, Жлобін, Жодзіна, Кобрын, Крычаў, Ліда, Мазыр, Маладзечна, Навагрудак, Наваполацк, Орша, Асіповічы, Пінск, Полацк, Рэчыца, Светлагорск, Слонім, Слуцк, Смалявічы, Смаргонь, Салігорск і Фаніпаль, за кожны жылы пакой, які здаецца (садовы домік, дачу), неабходна будзе заплаціць падатак у памеры 27 рублёў за кожны месяц здачы.

Стаўка такога падатку ў іншых гарадах абласнога, раённага падпарадкавання і пасёлках гарадскога тыпу ацэньваецца ў 19,2 рубля. Ва ўсіх астатніх населеных пунктах і тэрыторыях такая падатковая стаўка роўная 14 рублям 20 капейкам у месяц.

## Пытанне на засыпанне

***— Ці мае права кватарант прыводзіць у кватэру сяброў?***

— Запрашаць гасцей можна. Аднак жыць у здымнай кватэры яны могуць толькі пры ўключэнні іх у дагавор найму як членаў сям'і наймальніка або заключэнні дагавора бязвыплатнага карыстання паміж уласнікам і новым жыхаром.

***— Ці абавязаны арандатар паведаміць гаспадару кватэры, што з ім будзе жыць нехта яшчэ? Напрыклад, калі хлопец заключыў дагавор, але да яго плануе пераехаць дзяўчына.***

— Пры пісьмовай згодзе ўласніка кватэры наймальнік мае права пасяліць у сябе:

- жонку (мужа), бацькоў і дзяцей;
- родных братоў і сясцёр, дзеда, бабку, унукаў;
- іншых сваякоў і непрацаздольных утрыманцаў, якія заключылі з ім пісьмовае пагадненне аб прызнанні членам сям'і.

Дзяўчына ж не з'яўляецца членам сям'і. У гэтым выпадку павінен быць заключаны дагавор бязвыплатнага карыстання. Вось так.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ІНАВАЦЫІ Ў ТАЛЕРЦЫ

## Не за гарамі дзень, калі ласунам больш не спатрэбіцца выбіраць паміж стройнасцю і ахвотай да прысмакаў



Штогод у НПЦ па харчаванні НАН распрацоўваецца больш за сотню новых прадуктаў і тэхналогій для харчовай прамысловасці.

**У навукова-практычным цэнтры НАН Беларусі па харчаванні прадставілі прадукты «новага пакалення», якія неўзабаве можна будзе ўбачыць на паліцах крамаў і, вядома ж, пакаштаваць. Навукоўцы расказалі, як распрацоўваюцца рэцэптуры і ў якіх кірунках сёння вядуцца даследаванні.**

— У свой час была вылучана стратэгія развіцця беларускай харчовай прамысловасці: якасць прадукцыі — прыярытэт нумар адзін, — падкрэсліў **генеральны дырэктар НПЦ па харчаванні Нацыянальнай акадэміі навук Аляксей МЕЛЯШЧЭНЯ.** — Вось за якасць харчовай прадукцыі мы і адказваем. Пачынаючы з распрацоўкі нацыянальных і міждзяржаўных стандартаў і заканчваючы стварэннем канкрэтных рэцэптур, зыходзячы з патрэб усіх груп насельніцтва.

Найважнейшы кірунак работы НПЦ па харчаванні НАН — пытанні дзіцячага і школьнага харчавання, адзначыў Аляксей Меляшчэня. Акрамя таго, адна з галоўных тэндэнцый апошніх гадоў — скарачэнне цукру і солі ў прадуктах харчавання. Таксама вядзецца шырокі спектр даследаванняў па рапсавым масле (у тым ліку сумесна з РПЦ кардыялогіі). Ствараючы рэцэптуры і харчовыя тэхналогіі, навукоўцы бачаць сваю задачу ў тым, каб не дапусціць страты карысных рэчываў пры прамысловай апрацоўцы прадуктаў. А калі гэта адбываецца (напрыклад, пад уздзеяннем высокіх тэмператур памяншаецца колькасць вітамінаў і часткова знішчаецца бялок) — шукаюць спосабы ўзбагаціць прадукты, каб аднавіць узровень неабходных чалавеку кампанентаў. Улічваецца і той факт, што лад жыцця сучаснага чалавека часцей за ўсё не прадугледжвае высокіх фізічных нагрузак, а значыць, у харчаванні нам неабходна менш вугляводаў, але, напрыклад, больш бялку для работы мозгу.

### На варце якасці

Высокая якасць беларускіх прадуктаў харчавання дасягаецца шмат у чым дзякуючы рабоце спецыялістаў Рэспубліканскага кантрольна-выпрабавальнага комплексу НПЦ НАН па харчаванні.

— Наша лабараторыя акрэдытаваная ў Нацыянальнай сістэме акрэдытацыі на больш чым 650 метадаў даследаванняў, якія вызначаюць больш за 90 % нарманаваных паказчыкаў па ўсіх відах харчовай прадукцыі, — расказвае **кіраўнік храматаграфічнай лабараторыі Рэспубліканскага кантрольна-выпрабавальнага комплексу Наталля КАМАРОВА.** — Мы кантралюем якасць, бяспеку і сапраўднасць харчовай прадукцыі пры яе выпуску з вытворчасці, а таксама пры ўвозе ў нашу краіну.

Перад тым як трапіць на прылавак і далей — на стол да спажыўца, прадукты праходзяць праверку на адпаведнасць патрабаванням нарматыўнай дакументацыі. Штогод лабараторыя праводзіць даследаванне больш як 15 тысяч узораў па дзясятках паказчыкаў. Адчувальнае абсталяванне дазваляе ідэнтыфікаваць даданне раслінных алеяў у жывёльныя прадукты (такім чынам выкрываецца фальсіфікацыя), вызначае наяўнасць фарбавальнікаў, араматызатараў, пестыцыдаў (а гэта ўжо — пытанне бяспекі). Унікальнасць лабараторыі ў тым, што яна адзіная ў краіне акрэдытаваная на вызначэнне гліцыдзілавых эфіраў тлустых кіслот у раслінных алеях — а гэта паказчык канцэрагеннасці прадукту.

— За гады незалежнасці Рэспублікі Беларусь была выбудавана дакладная сістэма лабараторных комплексаў у складзе Міністэрства аховы здароўя, Дзяржстандарту, Мінсельгасхарча і НПЦ харчавання НАН. З задавальненнем хачу адзначыць, што гэтая сістэма вельмі эфектыўная. За апошнія 10 гадоў выпадкаў фальсіфікацыі прадуктаў харчавання мы амаль не выяўляем, — сказаў генеральны дырэктар НПЦ НАН па харчаванні. — Гэтая сістэма кантролю якасці прад'яўляе жорсткія патрабаванні ў адносінах імпарту і яшчэ больш жорсткія — у адносінах да ўнутранага вытворцы.

— Мы кантралюем як гатовую прадукцыю, так і сыравіну для яе вырабу, — адзначыла Наталля Камарова. — І менавіта ў гэтай лабараторыі была распрацавана метадалогія вызначэння пальмавага алею ў прадуктах харчавання.

Сёння ў харчовай вытворчасці гэты кампанент імкнуцца мінімізаваць, падкрэслілі спецыялісты.

### Кожнаму па патрэбах

Штогод у НПЦ па харчаванні НАН распрацоўваецца звыш сотні новых прадуктаў і тэхналогій для харчовай прамысловасці. Зараз вядучая тэндэнцыя пры распрацоўцы прадуктаў харчавання — персаналізаваны падыход, які ўлічвае патрэбы розных груп насельніцтва ў залежнасці ад ладу жыцця і ўзросту, стану здароўя і ўзроўню фізічнай актыўнасці. Напрыклад, навукоўцы стварылі лінію нізкабялковых прадуктаў для груп насельніцтва з фенілкетанурыяй, цэліякіяй і непераносімасцю глютэну. Гэта вялікая група людзей, і па ўсім свеце ў апошнія гады іх колькасць павялічваецца, падкрэслілі спецыялісты. І калі раней такіх прадуктаў у нашай краіне практычна не было, сёння створаны спецыяльныя кашы, пюрэ, сасіскі і «малочка», а таксама сумесь для выпечкі кексаў, у якіх наогул няма мукі. Імпартная прадукцыя такой накіраванасці адрозніваецца высокім коштам, беларускія ж прадукты таннейшыя — у сярэднім на 30—50 працэнтаў.



У дашкольным і школьным харчаванні вялікая ўвага — прадуктам без дададзеных цукроў.

Распрацавана і высокабялковая лінія — для людзей, якія займаюцца спортам. Прычым рэцэптуры ўлічваюць і спартыўны кірунак: бо сілавыя віды спорту патрабуюць хуткага вызвалення энергіі, а марафонцам, напрыклад, неабходна паступовае расшчапленне пажыўных рэчываў.

У дашкольным і школьным харчаванні вялікая ўвага ўдзяляецца прадуктам без дададзеных цукроў. У прыватнасці, гэта сокі прамога адціскання, якія ўжо выпускаюцца на Талачынскім кансервавым заводзе.

— Мы рэгулярна праводзім дэгустацыі для дзяцей і падлеткаў і бачым, што паступова яны пачынаюць выбіраць прадукты з меншым утрыманнем цукру, — распавёў **намеснік генеральнага дырэктара НПЦ па інавацыйнай рабоце Дзмітрый ЗАЙЧАНКА.** Бацькі больш увагі аддаюць фарміраванню правільных харчовых звычак у сям'і, і гэта адбіваецца на густах дзяцей. І, безумоўна, на іх здароўі, адзначыў спецыяліст.



А кексы, аказваецца, могуць быць увогуле без мукі.

На стварэнне навінкі звычайна патрабуецца год ці нават некалькі гадоў — ад ідэі да выпуску прадукцыі прадпрыемствам. Але нярэдка новы прадукт апярэджвае свой час. Спажывец бывае не гатовы да яго, распавялі навукоўцы. Напрыклад, па высокабялковых малочных прадуктах вялікая праца была праведзена яшчэ 12 гадоў таму. І толькі праз гады спажывец ацаніў іх — сёння, напрыклад, так званыя «грэчаскія ёгурты» незаменныя ў харчаванні многіх сем'яў, а іх выпуск наладзілі практычна ўсе вядучыя прадпрыемствы малочнай галіны Беларусі.

— Многае зроблена па бульбе, — распавёў Аляксей Меляшчэня. — А цяпер перад намі стаіць задача па мадыфікаваных крухмалах. Раней асноўнымі вытворцамі такіх прадуктаў былі краіны Еўрасаюза. Сёння тэхналагі беларускіх прадпрыемстваў актыўна працуюць разам з намі над стварэннем новых відаў мадыфікаваных крухмалаў для харчовай прамысловасці. Мадыфікаваныя крухмалы, дарэчы, не маюць дачынення да ГМА — гэта вынік пэўнай апрацоўкі бульбянога або кукурузнага крухмалу і незаменны кампанент многіх харчовых тэхналогій.

### Карысныя «пячэнькі»

А ў цэлым, адзначаюць навукоўцы, прынцыпы стварэння любой новай рэцэптуры — гэта максімальнае выкарыстанне айчыннай сыравіны плюс улік рэкамендацый Міністэрства аховы здароўя.

— Патрабаванні да харчовай прадукцыі пастаянна павышаюцца, Міністэрства аховы здароўя ўдакладняе звесткі па харчаванні асобных груп насельніцтва, — сказаў Аляксей Меляшчэня. — Напрыклад, узмацняюцца патрабаванні па ўтрыманні солі і цукру. А ў кандытарскай галіне цукар часта з'яўляецца структураўтваральнікам, і замяніць яго ў прамысловых маштабах атрымліваецца толькі шляхам новых тэхналагічных прыёмаў.

У лабараторыі кандытарскай і алейна-тлушчавай вытворчасці вядуцца распрацоўкі рэцэптур і тэхналогій інавацыйных кандытарскіх вырабаў. Напрыклад, з павышанай харчовай каштоўнасцю — за кошт дадання вітамінаў і мінеральных рэчываў, распавяла **загадчыца лабараторыі Ксенія ГЕРШОНЧЫК.** А таксама з выкарыстаннем рапсавага алею. Раней у склад цукровага печыва традыцыйна ўваходзіў зусім не карысны маргарын. Рэцэптура з рапсавым алеем ужо зацверджана, адпрацавана на вытворчасці (на фабрыцы «Спартак»), і хутка мы ўбачым такое печыва на прылаўках крам. Для вырабу карыснай выпечкі сёння навукоўцы праводзяць даследаванне па выкарыстанні жмыхаў алейных культур (растаропшы, лёну, гарбуза) — крыніцы поліненасычаных тлустых амега-кіслот і клятчаткі. І ў рамках агульнасусветнай тэндэнцыі здаровага харчавання вядзецца распрацоўка кандытарскіх вырабаў... наогул без цукру. Яго замяняюць сучасныя падсаладжвальнікі. Дарэчы, марожанае без цукру ўжо ёсць у продажы. Новае пакаленне кандытарскіх вырабаў (ад печыва да мармеладу) зможа пахваліцца таксама павышаным утрыманнем харчовых валокнаў і бялку.

### Нацыянальны здабытак

Сярод апошніх распрацовак Інстытута мяса-малочнай прамысловасці НПЦ НАН Беларусі па харчаванні — сухія закваскі для самастойнага вырабу ёгуртаў, смятаны і іншых карысных біяпрадуктаў у хатніх умовах. Мікраарганізмы ў складзе такіх заквасак (балгарская палачка, ацыдафільная палачка і г. д.) нармалізуюць біяфлору кішэчніка і аздараўляюць арганізм.

— Адметная рыса заквасак беларускай вытворчасці — тое, што гэтыя мікраарганізмы і іх камбінацыі створаны ўнутры краіны. І гэта безумоўны плюс, бо даказана, што карысней за ўсё харчавацца прадуктамі, выробленымі ў радыусе 50 км ад месца пражывання, — распавёў **дырэктар Інстытута мяса-малочнай прамысловасці Гардзей ГУСАКОЎ.**

Вучоны падкрэсліў, што рэспубліканская калекцыя заквасачных культур і мікраарганізмаў валодае статусам нацыянальнага здабытку, а беларускія сыры сёння экспартуюцца ў больш за 90 краін свету, уключаючы Еўрасаюз, Лацінскую Амерыку, Іран і ААЭ.

— Наш інстытут — першапраходзец у распрацоўцы рэцэптур сухіх малочных прадуктаў, у тым ліку для харчавання спартсменаў. Гэта яшчэ адна з экспартных ніш, — адзначыў суразмоўца.

А новая лінейка мясных прадуктаў з паніжаным утрыманнем солі ўжо атрымала высокую спажывецкую ацэнку (яе можна ўбачыць на прылаўках пад брэндам ME EAT TOO). Зараз інстытут вядзе работу з раслiннымі заменнікамі натуральнага малака і мяса — ствараецца лінія прадуктаў для веганскага харчавання.

— У Беларусі з сярэдзіны 1990-х гадоў самая пільная ўвага ўдзялялася харчовай бяспецы. Быў рэалізаваны шэраг дзяржаўных праграм, і сёння можна канстатаваць: харчовая бяспека ў нас створана, — падкрэсліў Гардзей Гусакоў. — Што датычыцца мяснай і малочнай прамысловасці, у нас няма патрэбы ў імпарце: каля 95 % гэтай прадукцыі на паліцах крам — беларускай вытворчасці.

Цяпер перад навукоўцамі стаіць мэта дамагчыся максімальнай разнастайнасці і багацця на прылаўках. Каб самы пераборлівы пакупнік змог знайсці тое, што яму даспадобы.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# НА АДЛЕГЛАСЦІ АДНАГО ФІЛЬМА

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

— Усе гэтыя дзевяць гадоў мы праязджалі міма закінутай драўлянай хаты, якая знаходзіцца за сто метраў ад нашага дома. І не звярталі на яе ўвагі, — кажа Артур Паўлаў. — І толькі летась, у маі, калі чарговы раз праязджалі міма, Лора (яна мастачка) кажа: «Артур, у мяне няма нармальнай майстэрні. А давай купім гэтую хату, і я буду ў ёй маляваць?» — «Трэба падумаць», — адказаў я. І ўжо ў чэрвені афармляў дакументы на той дом.

***— Як прыйшла ідэя зрабіць у простай вясковай хаце карцінную галерэю міжнароднага ўзроўню?***

— У хаце, якую мы з Артурам першапачаткова набывалі дзеля маёй майстэрні, сярод шматлікага хламу знайшлі дзве карціны ў рамах, — распавядае Лора Паўлава. — Адна з іх — рэпрадукцыя Шышкіна «Мардвінаўскія дубы» 1891 года. Аўтара другой мы не ведаем, але на ёй таксама прырода. Сёння яны займаюць пачэснае месца ў нашай пастаяннай экспазіцыі. Мы іх пакінулі, захавалі як частку гісторыі простай беларускай хаты, якая ператварылася ў мастацкую галерэю. Калі я ўпершыню зайшла сюды, прысутнасць карцін мяне ўразіла. Я адразу адчула, што ў доме добрая энергетыка і мне спадабаецца тут маляваць. І тады я ўявіла, што тут можна не толькі працаваць, але і ладзіць выставы. «Уяўляеш, — кажу Артуру, — калі тут, у Чаросаве, будуць выстаўляцца карціны розных мастакоў, сюды пачнуць ехаць людзі, у тым ліку і з-за мяжы, вёска яшчэ больш ажыве».



Лора ПАЎЛАВА.



Артур ПАЎЛАЎ адрэстаўрыраваў дом практычна сваімі сіламі. Такім чынам яму ўдалося істотна сэканоміць.

— Так з'явілася думка сумясціць майстэрню мастака з міжнароднай карціннай галерэяй... Я ўхапіўся за гэту ідэю, натхніўся, — кажа Артур. — У канцы ліпеня закасаў рукавы і заняўся рэканструкцыяй. Толькі тады яшчэ не ўяўляў, колькі ўсяго прыйдзецца перарабіць...

***— Вы набылі дом 13 чэрвеня мінулага года. І ўжо 24 снежня адбылося адкрыццё галерэі-дома мастака «Lora Pavlova gallery Lepey». Прайшло ўсяго нейкія паўгода — а старую хату не пазнаць. Як удалося так хутка ўсё адрэстаўрыраваць?***

— Як кажуць, вочы баяцца — а рукі робяць. Ідэя і жаданне — самы галоўны рухавік. Я працаваў амаль штодзень з раніцы да вечара. Практычна ўсё рабіў сам. Толькі час ад часу прыцягваў памочнікаў. Такім чынам сэканоміў шмат грошай. Многія ідэі нараджаліся ў працэсе рэканструкцыі, бо сюрпрызы былі на кожным кроку... Калі купілі хату, думалі: ну крыху падфарбуем сцены, падлогу, столь... А потым, пасля дажджу, высветлілася, што дах цячэ і печ дыміць... Таму прыйшлося цалкам замяніць стары дах на новы, а вялізную печ, якая займала 1/3 дома, на кампактную, больш энергаэфектыўную печ-камін. Дарэчы, старой цэгле мы далі другое жыццё — закрылі ёй адтуліны, якія засталіся ў падлозе на месцы былой печкі.

***— Можна было зруйнаваць старую пабудову і ўсё зрабіць з нуля. Але вы пайшлі іншым шляхам...***

— Каго сёння здзівіш сучасным будынкам? Яны ўсе аднолькавыя: сцены белыя, усё ідэальна роўнае. Нам хацелася, каб галерэя была з «разыначкай». Таму будавалі новае, захоўваючы ўсё добрае, старое...

***— Што ўдалося захаваць?***

— Цалкам захавалі стары зруб. Звонку абшылі яго сасновай дошкай па тэхналогіі вентфасаду. Унутры ж адмыслова пакінулі тэкстуру дрэва, я толькі зачысціў усе бярвёны шліфавальнай машынкай. У той частцы дома, дзе зараз месціцца выставачная зала, сцены былі атынкаваныя глінай па драўлянай дранцы. Мы крыху падрэстаўрыравалі тую тынкоўку, адмыслова захаваўшы ўсе няроўнасці, упадзіны і выпукласці, якія былі, і пафарбавалі ў белы колер. Такія сцены можна разглядаць доўга, яны — як асобны твор мастацтва. Таксама пакінулі старую падлогу, бо яна зроблена з дошак таўшчынёй каля васьмі сантыметраў. Цяпер такіх і не знайсці. Такая падлога, як я кажу, праслужыць вечнасць. Калі мянялі старыя вокны на новыя, аказалася, што яны «заваленыя» — стаяць не ў адной плоскасці з фасадам. Можна было, канечне, выраўняць па ўзроўні, але мы вырашылі захаваць і гэтую крывізну. Дарэчы, пасля таго як мы расчысцілі ўчастак ад зараснікаў, высветлілася, што з аднаго боку хаты, дзе зараз месціцца Лорына майстэрня, адкрываецца шыкоўны від на поле, таму мы адмыслова замянілі маленькія вокны на адно вялікае панарамнае. З мэблі, якая тут была, пакінулі толькі крэсла, якое дапамагала нам ад пачатку рэканструкцыі галерэі да канца. Мы сказалі яму «дзякуй» і, крыху падрэстаўрыраваўшы-падфарбаваўшы, падарылі другое жыццё.



***— Чаму вырашылі пафарбаваць дом у чорны колер?***

— У вёсцы ўсе старыя дамы традыцыйна сіняга, жоўтага, блакітнага, зялёнага колераў. Хацелася, каб галерэя выдзялялася, выглядала незвычайна, запамінальна. Спачатку былі думкі пафарбаваць яе ў шэры колер, але мяне апярэдзілі, у нашай вёсцы ўжо ёсць адзін шэры дом. Таму спыніліся на чорным. Дарэчы, мы трапілі ў топ самых арыгінальных будынкаў 2022 года, на думку інтэрнэт-партала, прысвечанага нерухомасці.



Цэгла ад старой печкі атрымала другое жыццё... на падлозе.

## Пра касмічны карабель ды лавандавае поле

***— Вы сапраўды верыце, што ў вясковую карцінную галерэю будуць прыязджаць гараджане, іншаземцы? Усё ж такі гэта няблізкі свет, 160 кіламетраў ад Мінска...***

— Калі б я не паверыў у гэту ідэю, гэтага праекта не было б. І касмічны карабель таксама калісьці быў нерэальны, і лазерная тэрапія, і нанатэхналогіі. Мне здаецца, чым складаней шлях, чым больш неверагодная мэта і мара, тым больш шанцаў яна мае на поспех. Людзі проста прызвычаіліся хадзіць у галерэі ў гарадах. Той жа, хто паедзе ў нашу вясковую карцінную галерэю — атрымае значна больш. Для чалавека гэта будзе цэлая прыгода. Не толькі наведванне экспазіцыі, але яшчэ і знаёмства з мастаком, з новым месцам. Галерэя знаходзіцца паблізу маляўнічага возера, каля ўзгорыстага ўчастка. А калі наведванне выставы сумясціць з сезонам цвіцення лаванды — прыцягальнасць месца павялічваецца ўдвая.

У вёсцы Чаросава побач з домам Артура і Лоры, што за дзесяць метраў ад возера, знаходзіцца лавандавае поле больш як з тысячы кустоў. Летась у ліпені яны правялі першы музычны фестываль «Лаванда Лепей» з фотасесіямі, выставай карцін, канцэртам, прэзентацыяй лавандавай прадукцыі.

— Апошнім часам вёскі становяцца ўсё больш прыцягальнымі. Таму мы плануем зрабіць лавандавы фестываль штогадовым і з часам выйсці на міжнародны ўзровень. Хочацца, каб людзі прыязджалі да нас, бо тут неверагодная прырода, энергетыка. Што датычыцца адлегласці... А што такое 160 кіламетраў? Гэта ўсяго дзве гадзіны на машыне. Дзве гадзіны — і вы ў іншым свеце. Я гэта называю «знаходзіцца на адлегласці аднаго фільма». Хтосьці ўладкоўваецца на канапе, уключае тэлевізар і глядзіць фільм. А нехта садзіцца ў машыну і за тыя ж дзве гадзіны едзе ў новае месца і даведваецца штосьці новае.

***— А як успрынялі галерэю мясцовыя жыхары?***

— Усё новае, як правіла, людзьмі ўспрымаецца насцярожана... Памятаю, калі мы з Лорай засадзілі ўчастак лавандай, вяскоўцы таксама спачатку не разумелі, маўляў, як гэта засадзіць увесь агарод кветкамі. А як жа бульба?.. Пасля прызвычаіліся і нават прыходзілі да нас на фестываль. Дарэчы, дзякуючы лавандаваму полю вёска ажыла. Тут ужо не засталося пустых дамоў — усе раскупілі. Вось і зараз некаторыя пакуль не разумеюць, як галерэя можа знаходзіцца ў вёсцы. Навошта яна тут? Тым не менш усім цікава. Цяпер шлях прагулак ва ўсіх мясцовых жыхароў ляжыць міма галерэі, каб паглядзець, што там такое.



Гаспадыня галерэі «Лепей» мастачка Лора ПАЎЛАВА запрашае ўсіх на выставу сваіх карцін.

У дамах і кватэрах на сценах рэдка можна ўбачыць твор мастацтва. Людзі набываюць дарагі санвузел, тэлевізар, але толькі не карціны... А шкада... «Ой, я ў мастацтве нічога не разумею», — гэтую фразу я чуў не ад аднаго чалавека. Мы ж спрабуем данесці, што мастацтва даступнае для ўсіх. Ты ж чуеш музыку — і яна табе альбо падабаецца, альбо не. Так і жывапіс. Карціна табе альбо падабаецца, альбо не. Культуру наведвання выставак, карцінных галерэй трэба пашыраць. Такім чынам, мы ўжо сёння сеем зерне любові да мастацтва. Хочам паказаць, што адпачынак можа быць не толькі перад тэлевізарам. Думаю, галерэя не апошні наш праект.

***— Мне вельмі адгукнуліся словы з афішы першай выставы, якая зараз праходзіць у вашай вясковай галерэі: «Ніколі не позна стаць тым, кім ты хочаш стаць! Можна пачаць калі заўгодна».***

— Сапраўды, Лора пачала свой шлях мастака ў 38 гадоў. Ёй спатрэбіліся дзесяцігоддзі, каб паверыць у сябе і пачаць дзейнічаць. Яна кажа, што цяпер стала значна больш шчаслівай. Я таксама пасля таго, як завяршыў рэканструкцыю вясковай хаты, адчуваю сябе хоць і стомленым, але шчаслівым. Асабліва як падумаю, наколькі важную справу для людзей мы робім. На адкрыцці галерэі было вельмі цёпла, душэўна, па-дамашняму. Людзей было няшмат. Прыехалі нашы сябры, сваякі... У нейкі момант да мяне падыходзіць Лора і кажа: «Уяўляеш, Артур, там да нас завіталі іншаземцы». Сапраўды, выходжу і бачу немца і японку. Лічу, гэта добры знак. Мы ж задумалі, што ў нас будзе міжнародная карцінная галерэя і самі таго не чакалі, але адкрыццё атрымалася міжнародным. Недарэмна кажуць: як карабель назавеш, так ён і паплыве... Таму не трэба баяцца, дазваляйце сабе самыя смелыя мары, рухайцеся ў абраным кірунку і яны абавязкова рана ці позна спраўдзяцца.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

**Фота з архіва герояў матэрыялу.**

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Табаквинторг» (продавец) извещает о проведении **<u>24 января 2023 года</u>** повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| |
|---|
| **ЛОТ № 1:** изолированное помещение с инвентарным номером 350/D-270126 площадью 190,9 кв. м, назначение – помещение общественного питания, наименование – помещение общественного питания. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Советская, 2-34. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000001000680, площадь 0,1128 га (доля в праве 24/313); назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания многоквартирного жилого дома и изолированного помещения, не относящегося к жилищному фонду |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС: 988 680,00** бел. руб.<br>**Задаток (10 %) с учетом НДС: 98 868,00** бел. руб. |
| **Дополнительные условия:** заключен договор аренды с ООО «Пицца Стар» до 26.01.2028 г. Изолированное помещение находится в здании, являющемся недвижимой историко-культурной ценностью |

**Продавец: ОАО «Табаквинторг»**, г. Гомель, ул. Могилевская, 1а.

Контактный телефон +375-44-599-02-90.

**Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона.**

**<u>Для участия в аукционе необходимо:</u>**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца ОАО «Табаквинторг»: р/с BY44PJCB30124055581000000933 в ОАО «Приорбанк» (г. Гомель, ул. Красноармейская, 3а), БИК PJCBBY2X, УНП 400078357.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений заканчивается 23.01.2023 г. в 16.00.**

**Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте <u>www.deloocenka.by</u>.**

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; стоимость должна быть выплачена в течение **15 (пятнадцати)** календарных дней со дня заключения договора купли-продажи; возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 1 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)».

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Табаквинторг» (продавец) извещает о проведении **<u>24 января 2023</u> года** повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| |
|---|
| **ЛОТ № 1:** изолированное помещение (назначение – торговое помещение, наименование – магазин) с инв. № 350/D-126579 общей площадью 1025,2 м², расположенное на земельном участке с кадастровым номером 340165500001000005 площадью 0,1361 га (доля в праве 74/100) по адресу: Гомельская область, г. Гомель, ул. Беляева, 5-65.<br>**Начальная цена продажи** с НДС: **1 261 800,00** бел. руб.<br>**Задаток (10 %)** с НДС: **126 180,00** бел. руб. |
| **Обременение:** заключен договор аренды от 27.04.2022 г. № 59 с ООО «ЕВРОТОРГ» на срок до 26.04.2027 г. |

**Продавец: ОАО «Табаквинторг»**, г. Гомель, ул. Могилевская, 1а.

Конт. тел.: +375-44-599-02-90, +375-232-25-26-46.

**Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона.**

**<u>Для участия в аукционе необходимо:</u>**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца ОАО «Табаквинторг»: р/с BY44PJCB30124055581000000933 в ОАО «Приорбанк» (г. Гомель, ул. Красноармейская, 3а), БИК PJCBBY2X, УНП 400078357.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений заканчивается 23.01.2023 г. в 16.00.**

**Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте <u>www.deloocenka.by</u>.**

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.**

Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; стоимость должна быть выплачена в следующем порядке: **20 %** от стоимости в течение **15 календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи; **30 %** от стоимости в течение **30 календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи; **50 %** от стоимости в течение **45 календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи; возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 1,0 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)».

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

## Сведения о результатах проведения рекламной игры

# «Призы в приложении Каталог Onliner 2»

1. Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

2. Сроки проведения рекламной игры: с 28.11.2022 по 06.02.2023 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения рекламной игры).

3. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4258 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 09.11.2022.

4. Количество участников рекламной игры – 75066 чел.

5. Информация о призовом фонде:

Размер призового фонда рекламной игры составляет 13534 (тринадцать тысяч пятьсот тридцать четыре) белорусских рубля 89 (восемьдесят девять) копеек. Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

6. Информация о победителях рекламной игры:

| № п/п | Фамилия, инициалы победителя | Сведения о выигрыше |
|---|---|---|
| 1 | Нестерович И.А. | Приз (тур № 1) – игровая приставка Sony PlayStation 5, денежные средства в размере 364,45 бел. руб. |
| 2 | Быдрицкий А.В. | Приз (тур № 2) – фен-стайлер Dyson Airwrap HS01 Complete (фуксия), денежные средства в размере 280,77 бел. руб. |
| 3 | Сокол В.Н. | Приз (тур № 3) – игровая приставка Sony PlayStation 5, денежные средства в размере 364,45 бел. руб. |
| 4 | Тарасов И.Е. | Приз (тур № 4) – фен-стайлер Dyson Airwrap HS01 Complete (фуксия), денежные средства в размере 280,77 бел. руб. |
| 5 | Гунцов А.С. | Приз (тур № 5) – игровая приставка Sony PlayStation 5, денежные средства в размере 364,45 бел. руб. |

7. Для получения приза победители должны явиться не позднее 06.02.2023 (включительно) по адресу: г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, предварительно связавшись с Организатором рекламной игры по номеру многоканального телефона + 375 (29) 514 35 24.

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 1. Система видеонаблюдения на территории пр. базы д. Боровляны; 2. Система видеонаблюдения РБУ на производственной базе г. п. Боровляны; 3. Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-71150 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административно-бытового корпуса, общая площадь – 773,8 кв. м, составные части и принадлежности – трехэтажное кирпичное здание административно-бытового корпуса с подвалом (А 3/к), входом в подвал, крыльцом) | Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Боровляны, ул. 40 лет Победы, д. 19А | 1 969 134,88 | 196 913,49 | 9 845,67 |
| 2 | Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-71158 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада, общая площадь – 34,9 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное здание склада) | Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Боровляны, ул. 40 лет Победы, д. 19А, корп. 4 | 41 174,86 | 4 117,49 | 205,87 |
| 3 | Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-71163 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание проходной, общая площадь – 20,4 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное здание проходной) | Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Боровляны | 28 543,53 | 2 854,35 | 142,72 |
| 4 | 1. Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-71139 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание растворобетонного узла, общая площадь – 888,9 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажное панельно-кирпичное здание растворобетонного узла с пристройкой К 1/к, пристройкой Л 1/к); 2. Испытательный пресс ТП-1-1500; 3. Автоматизированная бетоносмесительная установка BW MIX URWERK 287 БА/307; 4. Вагон-столовая; 5. Шкаф бухгалтерский ШБ; 6. Форма куба 3ФК-100, 5 шт.; 7. Электрический конвектор Ballu Camino Eco 2000; 8. Электрический конвектор Ballu Camino Eco 2000; 9. Стенд СП 01; 10. Аппарат высокого давления; 11. Стол компьютерный; 12. Стол 1400*550*750; | Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Боровляны, ул. 40 лет Победы, д. 19А, корп. 5 | 1 536 914,62 | 153 691,46 | 7 684,57 |
| 5 | Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-71122 (назначение – здание специализированное транспорта, наименование – здание ремонтной мастерской с гаражом, общая площадь – 661,9 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажное панельное здание ремонтной мастерской с пристройкой Ж1/к) | Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Боровляны, ул. 40 лет Победы, 19А/ 1 | 1 384 525,25 | 138 452,53 | 6 922,63 |
| 6 | Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-95345 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание столярного цеха, общая площадь – 738,7 кв. м, составные части и принадлежности – двухэтажное кирпичное здание столярного цеха с тремя пристройками В1/п, Г1/п, Д1/бл) | Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Боровляны, ул. 40 лет Победы, д. 19А, корп. 3 | 1 225 403,27 | 122 540,33 | 6 127,02 |
| 7 | 1. Шлагбаум;<br>2. ВАГОН-ДОМ ЭРУП-5;<br>3. ФБС 24.4.6 Н, 12 шт. | Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Боровляны, ул. 40 лет Победы, д. 19А | 3 835,20 | 383,52 | 19,18 |
| В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые торги | | | | | |
| **Ограничения (обременения):** Лоты №№ 1, 4, 5, 6 находятся в залоге. В отношении лотов №№ 1, 4, 5, 6 имеется обременение в виде договоров аренды. Дополнительная информация по тел. **+375293396845 (Артур)** | | | | | |
| Лоты №№ 1–6 расположены на земельном участке с кадастровым номером 623680601101002044, площадью 2.5059, для обслуживания зданий и сооружений производственной базы. Право постоянного пользования | | | | | |

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **16 февраля 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)**<br>по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 16 января 2023 года до 16.00 14 февраля 2023 года** |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ», проводимых 16.02.2023.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Андрей, +375293042560. Дополнительная информация по предмету торгов по тел.: +375293042560, +375293082897.**

8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и возникающих на его основании прав осуществляются Покупателем самостоятельно и за свой счет

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375173515452, +375293396845, e-mail: pc-bel@tut.by (220090, г. Минск, улица Широкая, д. 4, УНП 600013209)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# БРУДНЫ ГАРЫ

## Чым шакіравалі скандальныя мемуары брытанскага прынца




**Аўтабіяграфія брытанскага прынца Гары пад назвай Spare («Запасны») днямі афіцыйна паступіла ў продаж у Вялікабрытаніі. На сайце Amazon яна стала даступная за 14 фунтаў як у друкаванай, так і ў электроннай версіях і заняла першы радок у спісе бестселераў. Паводле інфармацыі брытанскіх СМІ, ганарар аўтара склаў 20 мільёнаў долараў, а выдавецтву Penguin Random House трэба будзе прадаць 1,7 мільёна копій аўтабіяграфіі, каб пакрыць свае выдаткі. Расказаць сваю гісторыю прынцу Гары дапамагаў амерыканскі журналіст і пісьменнік, лаўрэат Пулітцэраўскай прэміі Джон Джозеф Морынгер. Урыўкі з кнігі прынца ўцяклі ў сетку яшчэ да афіцыйнага пачатку продажу і выклікалі скандал (пагадзіцеся, насамрэч класіка хайпу). 415 старонак выкрыццяў члена брытанскай каралеўскай сям'і распавядаюць пра «брудную бялізну», якая на працягу дзесяцігоддзяў была схавана ад грамадства. Чым жа так шакіравалі скандальныя мемуары брытанскага прынца?**

### МЫЛЬНАЯ ОПЕРА

Пра тое, што ў вялікай брытанскай каралеўскай сям'і вялікія праблемы, стала вядома яшчэ ў 2019 годзе, калі герцаг і герцагіня Сасекскія (такі тытул быў у прынца Гары і яго жонкі Меган у бытнасць іх членамі сям'і) з'ехалі ад герцага і герцагіні Кембрыджскіх нібыта на фоне сваркі. Пасля адбыўся падзел іх агульнага дабрачыннага фонду The Royal Foundation, і Каляды 2019 года каралеўская сям'я адсвяткавала без Гары і Меган.

У студзені 2020 года пара афіцыйна абвясціла, што складае паўнамоцтвы членаў каралеўскай сям'і і з'язджае ў Амерыку. Прэса неадкладна ахрысціла тое, што адбываецца, «мегсітам» — па аналогіі з «брэксітам». Пасля звальнення з «раялаў» пара метадычна занялася злівам падрабязнасцяў аб жыцці сям'і. Іх выступленні ў СМІ, якія прэтэндавалі на сенсацыйнасць, пачалі з'яўляцца з той жа рэгулярнасцю, што і новыя эпізоды вядомага серыяла «Карона».

Ужо летам 2020 года ў Вялікабрытаніі выйшла біяграфія зорнай пары «У пошуках свабоды», напісаная журналістамі Амідам Скобі і Кэралін Дзюран. Фармальна гэта была незалежная журналісцкая праца, але многія (у тым ліку прынц Уільям) лічылі, што Гары і Меган садзейнічалі яе выхаду. Наступным эпізодам гэтай мыльнай оперы стала інтэрв'ю, якое Гары і Меган далі Опры Уінфры, — яно выйшла ў сакавіку 2021 года. Пасля — дакументальны серыял аб іх нягодах у коле каралеўскай сям'і, які выйшаў у снежні 2022-га — усяго праз тры месяцы пасля смерці каралевы Лізаветы II. Праўда, публіка была расчараваная: аб жыцці каралеўскай сям'і не было расказана нічога прынцыпова новага. Але затое Гары і Меган атрымалі ад Netflix за гэтую гісторыю 100 мільёнаў долараў.

Амаль адразу пасля гэтага было абвешчана аб новай кнізе прынца Гары. Дзеля раскруткі чарговай порцыі адкрыццяў ён быў гатовы пайсці на многае. Так, у інтэрв'ю журналісту Тому Брэдбі, з якім сябруе каля 20 гадоў, прынц зрабіў гучную заяву. Гары нагадаў, колькі болю яму прынеслі інтрыгі палаца, ад якіх пакутавала і яго жонка. Ён абвінаваціў сям'ю ў тым, што яны былі саўдзельнікамі іх «болю і пакутаў», таму і мае намер казаць пра гэта больш. Гары выпаліў, што сваякі нават «ляглі ў ложак з д'яблам», каб рэабілітавац свой імідж.

### БОЙКА ГЕРЦАГАЎ

Неверагодным чынам мемуары прынца Гары з'явіліся спачатку ў кнігарнях Барселоны, а потым ужо ў афіцыйным продажы ў Злучаным Каралеўстве. Менавіта іспанцы атрымалі шанц першымі прачытаць пікантныя падрабязнасці біяграфіі прадстаўніка знакамітага роду. Аднак памылку хутка выправілі, і іспанамоўныя версіі прыбралі на склад, але некалькі копій аказаліся ў распараджэнні брытанскіх журналістаў, якія і злілі грамадскасці самае «смажанае».

На англійскай мове мемуары называюцца Spare («Запасны»). Тэрмін паходзіць ад старадаўняй англійскай фразы «спадчыннік і запасны» (the heir and the spare), якую выкарыстоўвалі манархі, кажучы пра сваіх дзяцей — звычайна двух сыноў. Герцаг Сасекскі распавёў аб канфлікце са старэйшым братам Уільямам, цяпер — прынцам Уэльскім. Інцыдэнт адбыўся ў 2019 годзе ў яго лонданскім доме. Тады Уільям назваў жонку Гары Меган Маркл «рэзкай» і «грубай». Пасля чаго паміж братамі пачалася слоўная сварка, якая перайшла ў бойку. Па прызнанні аўтара мемуараў, усё здарылася за лічаныя секунды. «Ён схапіў мяне за каўнер і паваліў на падлогу. Я прызямліўся на сабачую міску, якая трэснула ў мяне пад спінай. Аскепкі ўпіліся ў мяне», — згадвае прынц.

У кнізе герцаг Сасекскі распавядае і пра складаныя ўзаемаадносіны з мачахай Камілай. Ён абвінавачвае яе ў тым, што менавіта яна шмат гадоў злівала прэсе падрабязнасці яго адносін з сям'ёй. На думку аўтара, на такі крок жонка Карла III пайшла дзеля рэабілітацыі ўласнага іміджу. У сваёй кнізе герцаг называе цяперашнюю каралеву-кансорта «небяспечнай зладзюжкай». Вядома, што Каміла сустракалася з Чарльзам да яго жаніцьбы на прынцэсе Дзіяне, маці прынца Гары. Аднак тады бацькі будучага брытанскага караля не злічылі яе роўняй для будучага спадчынніка пасаду. Сувязь Камілы і Карла аднавілася пасля таго, як ён ажаніўся з Дзіянай. Праз некаторы час пасля гібелі лэдзі Дзі цяперашні манарх і Каміла ажаніліся. Многія жыхары Туманнага Альбіёна лічылі, што менавіта Каміла разбурыла шлюбнае жыццё Дзіяны і Чарльза. Аднак пазней грамадскасць усё ж змяніла да яе стаўленне. Завааваць сэрца брытанцаў Каміле ўдалося дзякуючы свайму такту і сціпласці. Аднак для Гары, як высвятляецца, гэта не мела эфекту.

### НАРКОТЫКІ І ЗАБОЙСТВЫ

38-гадовы Гары адкрыта апісвае ў кнізе розныя выпадкі са свайго жыцця. Напрыклад, прызнаецца, што ўжываў наркотыкі пачынамсі да 2016 года. Упершыню ён паспрабаваў какаін у 17-гадовым узросце падчас візіту ў загарадны дом свайго прыяцеля. Ён таксама паліў марыхуану ў Ітане (дзе вучыўся) і на тэрыторыі Кенсінгтонскага палаца. Адзін з момантаў у «Запасным» — апісанне, як Гары ўжываў наркатычныя грыбы ў доме зоркі серыяла «Сябры» Кортні Кокс у Каліфорніі. Гары быў захаханы ў актрысу, а грыбы на вечарынцы запіваў тэкілай. У сваёй кнізе герцаг Сасекскі падрабязна распавёў, як пазбавіўся нявіннасці ў падлеткавым узросце. Упершыню малодшы сын караля ўступіў у інтымную блізкасць з жанчынай нашмат старэйшай за яго. Любоўным уцехам, як прызнаецца Гары ў сваіх мемуарах, яны аддаліся ў полі побач з пабам. «Напэўна, нас нехта бачыў», — згадвае прынц.

Разважае Гары і пра самыя трагічныя выпадкі свайго жыцця. Расказваючы аб ваеннай службе ў Афганістане, ён прызнаўся, што забіў 25 чалавек: «Я заўсёды мог дакладна сказаць, колькі варожых камбатантаў забіў... Такім чынам, мой лік — 25. Гэта не напаўняла мяне задавальненнем, але я і не адчуваў сораму». 38-гадовы прынц таксама прызнаўся, што ставіўся да «сваіх» забітых не як да людзей, а як «да шахматных фігур, якіх прыбіраюць з дошкі».



Гэтыя ўспаміны выклікалі бурную рэакцыю не толькі ў Вялікабрытаніі, але і за яе межамі. Адстаўныя брытанскія вайскоўцы заявілі, што прынцу не варта было быць настолькі адкрытым. Палкоўнік у адстаўцы Рычард Кемп, які камандаваў войскамі ў Афганістане, заявіў у інтэрв'ю каналу Sky News, што такія падрабязныя ўспаміны Гары могуць нашкодзіць рэпутацыі прынца і «несправядліва афарбаваць у негатыўнае адценне» брытанскае войска. «Яго сцвярджэнні аб знішчэнні 25 чалавек могуць настроіць супраць яго шматлікіх людзей, — мяркуе палкоўнік у адстаўцы. — Хачу спадзявацца, што ён знаходзіцца пад надзейнай аховай ці ў кога не атрымаецца адпомсціць яму. Але гэта толькі адна праблема. Другая праблема такіх адкрыццяў — яны могуць быць успрынятыя так, як быццам у брытанскім войску яго навучылі такім чынам, што ён не лічыў сваіх ворагаў людзьмі, а толькі шахматнымі фігурамі на дошцы». Ваенны эксперт заўважыў, што «словы герцага Сасекскага могуць павялічыць рызыку тэрактаў супраць грамадзянскіх асоб і вайскоўцаў Злучанага Каралеўства».

Вядома, рэзкая рэакцыя была і ад прадстаўнікоў руху «Талібан», якія цяпер знаходзяцца ва ўладзе ў Афганістане. Прадстаўнік руху Сухаіл Шахін заявіў, што прынц павінен адказаць на пытанні «суда, які займаецца злачынствамі супраць чалавечнасці». «Містар Гары! Тыя, каго вы забівалі, — не шахматныя фігуркі — яны былі людзьмі! У іх былі сем'і, якія чакалі іх вяртання дадому», — заявіў саветнік міністра ўнутраных спраў Афганістана Анас Хакані. Міжнародная супольнасць павінна пакараць брытанскага прынца Гары за забойствы жыхароў Афганістана падчас шматгадовай аперацыі міжнародных сіл на тэрыторыі краіны. Як паведамляе ў панядзелак брытанскі тэлеканал Sky News, з такім заклікам выступілі ўлады афганскай правінцыі Гільменд. Талібы заклікалі судзіць прынца Гары, які распавёў пра свае забойствы ў Афганістане. У Гільмендзе, дзе служыў прынц, прайшоў мітынг, для якога людзі падрыхтавалі плакаты з яго выявай і перакрэслілі твар чырвоным крыжам.

### ПАЧЫМ ГОНАР ВІНДЗАРАЎ?

Мемуары прынца Гары выклікалі неадназначную рэакцыю не толькі з-за ўспамінаў пра Афганістан. У інтэрв'ю The Guardian біёграф брытанскага караля Карла III (раней таксама вядомага як прынц Чарльз) Кэтрын Маер назвала магчымыя наступствы выхаду кнігі для каралеўскай сям'і катастрафічнымі». «Магчыма, гэта стане нечым, што паслужыць пачаткам канца манархіі. І менавіта гэта мы павінны зараз абмяркоўваць. Важна і тое, што гэта адбываецца на фоне падзення даверу да дзяржавы і росту радыкальна правых настрояў у палітыцы», — мяркуе эксперт.

Як пераканаты старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра брытанскіх даследаванняў Алег Ахошын, «гэты скандал можа прывесці да далейшай дыскрэдытацыі каралеўскай дынастыі ў Вялікабрытаніі, але ён не выкліча сур'ёзнага палітычнага дыспуту з нагоды формы праўлення ў краіне». «Брытанцы прывыклі да манархіі, гэта частка іх гістарычных традыцый. Манарх з'яўляецца для іх сімвалам адзінства нацыі, — заўважыў эксперт mir24.tv. — Таму асобныя члены каралеўскай сям'і не могуць паўплываць на існаванне самога інстытута манархіі».

Па словах эксперта, матывацыя прынца Гары заключалася не столькі ў атрыманні дадатковых даходаў ад публікацый гэтых мемуараў, колькі ў тым, што ў яго назапасілася даўняя крыўда ў адносінах да сваіх сваякоў, у прыватнасці да бацькі, які цяпер кіруе, караля Карла III, і да старэйшага брата — прынца Уільяма. «Невыпадкова мемуары ў рускім перакладзе называюцца «Запасны». Менавіта так прынц Чарльз называў свайго малодшага сына, надаючы яму значна менш увагі, чым яго старэйшаму брату, і маючы зносіны з ім больш фармальна, а не падтрымліваючы цёплыя бацькоўскія адносіны», — адзначае эксперт.

«Прынц Гары і так дастаткова скандальная асоба, наконт яго склалася даволі ўстойлівая грамадская думка. Скандалы вакол асобы прынца Гары часцей за ўсё звязаны з яго вечарынамі, ужываннем алкаголю і забароненых рэчываў, а таксама з іншымі яго выхадкамі. Прынц Гары запомніўся грамадству менавіта такім: яшчэ ў 2017 годзе ён атрымаў у брытанскай прэсе мянушку «шалёнае дзіця», і гэтая рэпутацыя ўсё жыццё за ім ішла. А шлюб з Меган Маркл толькі пагоршыў сітуацыю, таму што яна не хацела прытрымлівацца рэгламенту каралеўскай сям'і і грэбліва ставілася да брытанскіх традыцый. Меган успрымала жыццё ў палацы як жыццё прынцэсы з дыснэеўскага мульціка — у якой былі толькі правы і не было ніякіх абавязкаў», — тлумачыць Ахошын.

Даследаванне, праведзенае YouGov 5-6 студзеня, паказала, што толькі крыху больш за чвэрць з амаль 1,7 тысячы апытаных цяпер пазітыўна ўспрымаюць малодшага сына караля Вялікабрытаніі Карла III. Гэта найніжэйшы ўзровень з моманту пачатку правядзення такіх замераў у 2011 годзе. Адначасова рэкордна вялікая колькасць рэспандэнтаў — 64 працэнты — прызналіся, што адмоўна ставяцца да прынца, які займае пятае месца ў чарзе спадчыны прастола. Для параўнання: да 2017 года ўзровень адабрэння Гары брытанцамі вагаўся на ўзроўні 80 працэнтаў, а неўхвалення — у дыяпазоне ад 10 да 20 працэнтаў.

У брытанскіх сацсетках набірае папулярнасць хэштэг #shutupHarry («заткніся, Гары»), пад якім інтэрнэт-карыстальнікі дзеляцца сваім меркаваннем аб выкрыццях герцага. «Пачым гонар каралеўскай сям'і — свежыя пікантныя падрабязнасці ад прынца Гары», — піша адзін з каментатараў. «Часам яго хлусня крыўдная, часам яго хлусня дурная, а часам яго хлусня смешная!» — адзначае другі карыстальнік. «Цікава, ці шкадуюць тыя арганізацыі, якія ўзнагародзілі Гары гэтымі фальшывымі гуманітарнымі ўзнагародамі, пра гэтае рашэнне, даведаўшыся, што ён адкрыта кажа аб колькасці сваіх забойстваў і называе гэтых мёртвых людзей «шахматнымі фігурамі»?» — заўважае яшчэ адзін каментатар.

Тым часам, тэлеканал Sky New паведаміў, што «Запасны», па словах яго выдаўца, ужо стаў самай хутка прадаванай нематастацкай кнігай у гісторыі. Transworld Penguin Random House заявіў, што толькі за першы дзень былі прададзены рэкордныя 1 мільён 400 тысяч экзэмпляраў у цвёрдай вокладцы, электронных кнігах і аўдыяфармаце, паспех кнігі перасягнуў нават самыя аптымістычныя чаканні. На брытанскім сайце інтэрнэт-крамы Amazon «Запасны» адразу трапіў у спісы бестселераў і стаў галоўнай сенсацыяй месяца. Праект «брудны Гары» зарабляе грошы.

**Захар БУРАК.**

# БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР НА 2023 ГОД

**Народны каляндар — гэта сістэма памятных дзён-хранонімаў (свят, ігрышчаў, абрадавых звычаяў, прысвяткаў, працоўных дзён), якія адлюстроўваюць прыродна-храналагічныя веды беларусаў і зафіксаваны ў вуснай традыцыйнай творчасці. Асобныя старадаўнія прыкметы надвор'я, якія звязаны з пэўнымі датамі календара, цяпер ужо страцілі сваю актуальнасць. Святкаванні і даўняя абраднасць засталіся толькі ў гістарычнай памяці, а іншыя — у актыўным сучасным бытаванні. Сістэматызаваны беларускі народны каляндар разам з велікодна-валачобнымі песнямі, якія ў строгай храналагічнай паслядоўнасці апісваюць традыцыйныя прысвяткі і святы, у тым ліку тыя, што закансерваваліся ў непараўнальных паэтычных узорах як Навагоддзі/Навалецці, з'яўляецца нашым шэдэўрам і фенаменальнай з'явай сусветнай нематэрыяльнай культуры. Акрамя таго, валачобныя песні, што выконваліся на Вялікдзень, тагачасны Новы год/лета, уяўляюць сабой паэтычны каляндар, падобнага якому няма сярод традыцый народаў зямлі.**
**У народным календары на 2023 год прадстаўлены асноўныя святы і прысвяткі з кароткімі тлумачэннямі, прыкметамі, прымаўкамі, урыўкамі з валачобных песень і г. д. Дні, якія адзначаюць беларусы-католікі, выдзелены курсівам.**
**Зорачкай /*/ пазначаны святы «рухомай» царкоўнай пасхаліі, што не маюць сталага месца ў годзе.**
**У наступным, 2024-м, годзе па каталіцкай пасхаліі Вялікдзень (Пасха) 31 сакавіка і па праваслаўнай — 5 мая.**
**Умоўныя абазначэнні: п — панядзелак, а — аўторак, с — серада, ч — чацвер, пт — пятніца, сб — субота, н — нядзеля. Асобныя астранамічныя звесткі, што падаюцца, адносяцца да Мінска.**
**Больш падрабязна пра значэнне хранонімаў календара можна прачытаць у кнігах Алеся Лозкі «Беларускі народны каляндар» (Мінск, 1993, 2002) і інш.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## СТУДЗЕНЬ

**1. н. Новы год.** ВКЛ перайшло на студзеньскі стыль у 1550 г., Расія — у 1700 г.
**6. пт. Першая, Посная куцця.** Перадкалядная вячэра. Які дзень, такі і год. ***Богаз'яўленне, Тры Каралі.*** Католікі праводзілі маскіраваны абрад «Тры каралі», або «Гэроды».
**7. сб. Раство Хрыстова.** Пачатак **Каляд.** «Ой, Калядачкі, бліны-ладачкі...». Калядавалі. Насілі «звязду». Паказвалі батлейку, праводзілі ігрышчы («вадзілі казу», «жанілі Цярэшку», «пяклі ката», гулялі ў «Яшчура» і інш.).
**9. п. Сцяпан.** Даўней дзень найму слуг, батракоў на год. «На святога Сцяпана вышэй слуга за пана».
**13. пт. Шчодрая куцця.** Пачатак **Шчодрага тыдня.** «Мароз, хадзі куццю есці».
**14. сб. Васілле.** Новы год па праваслаўным календары. «Сею, сею пасяваю, з Новым годам вас вітаю».
**18. с. Трэцяя, Галодная, Вадапосная куцця.** Апошнія дні Каляд. «Каляда ад'язджае».
**19. ч. Вадохрышча (Кшчэнне).** «Святое Кшчэнне ваду ксціла.., свет ачысціла і ваду наверх пусціла», «На Вадохрышча завіруха — на Вялікдзень таксама».
**20. пт. Прывадохрышча** — заканчэнне Каляд. Пачатак **Малой вясельніцы** (да посту).
**24. а. *Аксіння.*** «Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце». Фядос. «На Фядоса цёпла».
**25. с. *Павел.*** «Вее вецер — будзе вайна». **Таццяна.** Свята студэнтаў.
**31. а. Апанас, Гусінае свята.** Свята свойскай жывёлы. «Хавай нос у апанасаўскі мароз».

## ЛЮТЫ

**1. с. *Ігнат.*** «На Святога Ігната зіма багата».
**2. ч. *Грамніцы, Стрэчанне.*** «Калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца вол травіцы», «Грамніца — хлебу палавіца».
**5. н. *Агата.*** Каровіна свята. «Хлеб і соль святой Агаты не пусціць бяды да хаты».
**6. п. *Дарота.*** «Па Дароце высахнуць хусты на плоце». ***Паўзіміца Аксіння.*** «На Аксінні мяце», «Які дзень на Аксінню, такая будзе і вясна».
**11. сб. Ігнат.** «Ігнат Грамніцам рад».
**12. н. Стрэчаньскія Дзяды.**
**13. п.** Пачатак ***Памінальнага, Дзедавага тыдня.**
**14. а. *Валянцін.*** Свята закаханых. **Трыфан.** «На Трыфана зорна — вясна позняя».
**15. с. Грамніцы, Стрэчанне.** «Зіма з летам сустракалася, пра здароўейка пыталася». «На Грамніцы палавіна зіміцы».
**17. пт. *Дзедава пятніца.**
**18. сб. Агата.** Каровіна свята. ***Памінальніца.** Канец Памінальнага тыдня. Калі «вея» ў нядзелю, то авёс трэба сеяць на 9-м тыдні, калі ў панядзелак — то на 8-м, калі ў сераду ці чацвер — то пакідалі «дзесяцінкі дзве».
**20. п. *Рабы тыдзень, Вясельніца, Развітальны, Сырапусны, Масленічны тыдзень.** Тыдзень перад Масленіцай. Які добры дзень на Масленым тыдні, у той дзень ад Ільі сеялі лён. Дзяўчаты вешалі «калодкі» нежанатым хлопцам. ***Дзень сустрэчы** на Масленым тыдні.
**21. а. *Залвіцыны вячоркі.**
**22. с. *Серада Папяльцовая*** (пач. Вялікага посту ў католікаў, да 08.04). ***Лысая серада.** На ўзгорках з'яўляюцца «пратáліны-залысіны».
**23. ч. *Блакітны чацвер.** Тумановы дзень. ***Крывы, Тлусты чацвер, Валосы, Валосся.** Свята жывёлы. «На Валосага бліны пяклі ці аладкі, каб былі валы гладкі».
**24. пт. *Мацей.*** «На Мацея дарога пацее», «На Мацея адліга — будзе мароз». Уласcе, Аўлас. Свята жывёлы. «Аўлас на сыры лас», «Ты, Улас, Улас. Ты найміся ў нас скату пасцівіць».***Цешчыны вечары.**
**25. сб. *Масленыя Дзяды (Бабы).** «Дзяды не зналі бяды, а нашы ўнукі зазналі мукі».
**26. н. *Масленіца.** «Масленіца ў «вятху» (пасля поўні) — дзяржы пшаніцу ў мяху, сей пшаніцу на ўсю руку». ***Развітальны, або Дараваны дзень. *Гуканне вясны.** «Благаславі, Божа, зіму замыкаці, вясну загукаці». На Палессі вадзілі карагоды, «спявалі чыракчу», насілі ёлку з вянком. **Фаціння.** Заступніца ад хвароб (ліхаманкі, трасцы і інш.).
**27. п. *Паласказуб.** Першы дзень Вялікага посту (да 15.04). Паласкалі зубы гарэлкаю (у час посту больш не пілі).

## САКАВІК

**1. с. *Уступная серада.** Каб урадзіў лён, мылі верацёны ці калаўроты, хадзілі ў карчму і пераскоквалі праз пень.
**4. сб. *Казімір.*** «Святы Казімір дровы сячэ і ў клад кладзець». ***Зборава субота.** Абрад «споведзі дзежкі».
**5. н. *Зборніца, Ізбор.** Адзін з варыянтаў Новага года/лета пасля прыняцця юліянскага летазлічэння. «Святы Ізбор упярод ступіць». Пачатак збору селяніна ў поле.
**9. ч. Янка, Паўраценне.** Мядзведзь паварочваецца ў берлагу на другі бок.
**12. н. *Рыгор.*** «На святога Рыгора ідуць рэкі ў мора».
**13. п. Васіль Капальнік.** Са стрэх капае.
**14. а. Аўдоцця Вясноўка, Аўдокі. Гуканне вясны.** «На Аўдокі голы бокі». (1.03 Новы год/Новае лета ў мінулым, сакавіцкі каляндарны стыль). «Святы Еўдакей ... пераступ года», «Калі на Аўдакеі добрае надвор'е, то будзе добры лён».
**15. с. Хвядот.** «На Хвядота занос — усё сена знясе».
Літаральна за пяць гадоў калекцыя магілёўскага кніжніка вырасла да некалькіх тысяч знакаў. Сваю кнігу «Экслібрыс» Мікалаю Якаўлевічу даслалі Яўген Мінаеў і Сяргей Фарцінскі. Зразумела, пашырэнню калекцыі спрыяла ўвогуле высокая кніжная культура тых дзесяцігоддзяў. Уражлівымі былі тыражы кніг мастацкай і папулярнай літаратуры. У Савецкім Саюзе існавала мноства кніжных выдавецтваў. Цэнзура, сістэмная ідэалагічная работа не былі перашкодай для развіцця кнігазбіральніцкіх зацікаўленняў грамадства. Хаця, канешне ж, далёка не кожная кніга прабівалася да чытача... І гэта было сярод характарыстык таго часу...

У 1968 годзе Мікалай Веліканаў вырашыў паказаць свае зборы, іх частку, гледачам. Калекцыянер яшчэ не ўяўляў, з якімі цяжкасцямі яму давядзецца сутыкнуцца. Слова — успамінам самога магілёўскага экслібрысіста: «... звярнуўся за дапамогай да дырэкцыі і прафкама. Склаў праект каталога «Што такое экслібрыс?», у які ўключыў больш як 300 кніжных знакаў. Пералік склаў па ўладальніках, што было навінкай і выклікала крытыку самога У. Каралюка...» Уладзімір Дарафеевіч Каралюк (1921—1981) — гісторык-славіст, спецыяліст па Сярэднявеччы, даследчык экслібрыса. У 1960-я гады — намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Советское славяноведение». У 1968 годзе якраз выйшла кніга У. Каралюка «Сучасны савецкі экслібрыс». Крытыка дасведчанага знаўцы, вопытнага калекцыянера, відаць, была звязана з тым, што раней класіфікавалі работы на выстаўках экслібрыса па аўтарстве... «З вялікімі цяжкасцямі вёў барацьбу з мясцовай цэнзурай (абллітам), — згадвае ў сваіх успамінах Мікалай Якаўлевіч. — Не давалі дазвол друкарні на выпуск каталога. Паўгода «хадзіў па пакутах» — абласное ўпраўленне культуры, друку, у Доме Саветаў адмаўлялі ўвогуле ў правядзенні «непатрэбнай выстаўкі». Загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Магілёўскага абкама КПБ адказаў мне ў сваім кабінеце: «Жылі да гэтага часу без экслібрыса — пражывём і далей без яго...»

Веліканаву ўдалося прабіцца на прыём да сакратара Магілёўскага абкама Кампартыі Беларусі па ідэалогіі Ларысы Міхайлаўны Барабанцавай. У яе хапіла і розуму, і адукаванасці, і такту падысці да справы далікатна, з павагай да захаплення Мікалая Якаўлевіча. Дала распараджэнне цэнзуры: дазволіць адкрыццё выстаўкі, дазволіць выданне каталога. А па тэлефоне ў прысутнасці Мікалая Якаўлевіча яшчэ і дадала: «Хопіць здзекавацца з калекцыянера — Дон Кіхота!» Такая сустрэча надала сіл, дазволіла і выстаўку правесці як след, і справу далей з новым натхненнем прадаўжаць. 28 снежня 1968 года з адкрыццём першай выстаўкі кніжнага знака Магілёў далучыўся да беларускіх гарадоў — сталіц экслібрыса!.. Калі і не сталіц, то хаця б тых гарадоў, дзе экслібрыс уганаравалі, акрэслілі яго месца ў кніжніцтве і ўвогуле ў культуры, асветніцтве.

На працягу 1969—1970 гг. з уласнай калекцыі Мікалай Веліканаў арганізаваў яшчэ тры выстаўкі. Друкаваліся магілёўскія каталогі, якія пасля экслібрысіст высылаў калекцыянерам па ўсім Савецкім Саюзе. Дарэчы, у гэты ж час у Баранавічах апантана прапагандай экслібрыса займаўся Валерый Палікарпаў. У Мінску рыхтавалі да друку сваю кнігу «Беларускі кніжны знак» Анатоль Тычына і Віктар Шматаў. Веліканаў сярод сваіх калекцыянерскіх стасункаў з 1967 года вылучаў ліставанне з мастаком Аляксеем Юпатавым. Яшчэ да завочнага знаёмства з ім сабраў болей чым 100 экслібрысаў у яго выкананні. Усяго да 1971 года — і ад самога мастака, і ад калекцыянераў з іншых гарадоў — Мікалай Якаўлевіч сабраў каля 400 юпатаўскіх экслібрысаў. Паступова ўзнікла жаданне правесці ў Магілёве выстаўку «Кніжныя знакі Аляксея Юпатава». Над падрыхтоўкай калекцыянер працаваў каля года. За дазволам аддрукаваць каталог звярнуўся ў Мінск, у Галоўліт. Фармальнага (пісьмовага) адказу не паступіла. Пайшоў ізноў у Магілёўскі абкам партыі. Дапамог зняць пытанне з цэнзурай малады адукаваны загадчык сектара друку Венядзікт Палікарпавіч Бярбега. Выстаўка праходзіла ў Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі. Па горадзе былі расклеены афішы-плакаты. На жаль, сам Юпатаў на выстаўку прыехаць не змог... Магілёўчане чарговы раз былі ўражаны прыцягненнем кніжнага знака, прыцягненнем графікі малой формы. На выстаўку прыязджалі наведвальнікі і з іншых гарадоў Беларусі...

У 1971 і 1972 гадах М. Веліканаў арганізаваў у Магілёве персанальныя выстаўкі мастакоў-экслібрысістаў Я. Ціханоўча і А. Калашнікава. Ізноў былі «хаджэнні па пакутах». Але 6-я і 7-я выстаўкі прайшлі «на ўра!». Праўда, нават у прыватным выпадку не зазірнуў на такое светлае кніжнае свята ніхто з магутнай кагорты чыноўнікаў ад культуры... Што ж, яны, відаць, і слова такое — «экслібрыс» — не вывучылі... Мікалай Якаўлевіч пачаў рыхтаваць экспазіцыю і праект каталога да 8-й выстаўкі — на тэму «Магілёўскі экслібрыс». Знакаў па гэтай тэматыцы назбіралася каля 100. Новы магілёўскі цэнзар аказаўся больш абачлівым і рашучым, чым яго папярэднікі, і адразу вынес вердыкт: «Хопіць выставак!» Змянілася на той час і дырэкцыя завода, на якім працаваў Веліканаў. І калі ён звярнуўся па невялікую падтрымку, каб аддрукаваць каталог, аплаціць абсталяванне, у адказ пачуў: «Грошай няма...»

Было яшчэ некалькі спроб арганізаваць выстаўку пад нумарам восем — «Ясеніяна ў кніжных знаках». Дырэктар краязнаўчага музея заўважыў сціпла: «Нам такая справа не пад сілу». Настрою такое стаўленне да экслібрыса не дадавала. Сіл, вагі, каб змагацца з бюракратамі і малаадукаванымі людзьмі, у Веліканава не было. Зусім яны сышлі на нішто, калі пачуў адмову і ў арганізацыі выстаўкі «500 экслібрысаў пра Пушкіна»... Уладальнік вялікай калекцыі, якая, несумненна, магла б прынесці славу гораду на Дняпры, застаўся са сваім зборам сам-насам. Узрост падштурхоўваў да пошуку пытання: «А што далей?..»

У 1983 годзе ў Магілёў наведаўся, каб пазнаёміцца з Мікалаем Якаўлевічам, дырэктар Дзяржаўнага мастацкага музея БССР Юрый Аляксандравіч Карачун. Уважліва агледзеў калекцыю і рашуча сказаў: «Забяром!» 10 000 экслібрысаў трапілі ў дзяржаўны музей. У 1984 годзе Мікалай Якаўлевіч атрымаў за гэта 15 000 рублёў. Напярэдадні былі новыя часіны, калі і грошы ў ашчадных банках абясцэньваліся, калі пераглядаліся каштоўнасці жыцця, калі ўзнікала пытанне самога існавання... А Веліканаў, чалавек сталага ўзросту, са сваімі асветніцкімі памкненнямі аказаўся нікому непатрэбным. Дарэчы, ён цікавіўся лёсам сваёй калекцыі ў фондах рэспубліканскага музея... 27 лістапада 2001 года атрымаў адказ: «...Калекцыя экслібрысаў, атрыманая ад Вас у 1983 годзе, знаходзіцца ў Музеі. Паколькі яна ўключае значную колькасць адзінак, праца над яе апісаннем і навуковай апрацоўкай будзе ісці доўгі час. На дадзены момант апрацаваны 400 экспанатаў гэтай калекцыі...» Што тут каментаваць? Прайшло яшчэ дваццаць гадоў «з хвосцікам». Даўно няма сярод нас Мікалая Якаўлевіча Веліканава. Мо што змянілася са стаўленнем да сабранай ім калекцыі?..

Экслібрыс, лёс якога пачынаецца з XVI стагоддзя, развіваецца ў Беларусі і цяпер. Мастакі, разумеючы, што кніжны знак ужо не з'яўляецца адно толькі адметнасцю, пазнакай асобнікаў кніг з розных кнігазбораў, працуюць не столькі для кнігалюбаў, колькі для калекцыянераў, ствараючы экслібрысы. І ўсё ж повязь такіх твораў з кнігай па-ранейшаму застаецца неад'емнай. Творчасць беларускіх мастакоў у галіне экслібрыса заўважаюць ва ўсім свеце: ад Кітая і Японіі да Германіі і Грэцыі...

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

Выпуск № 1 (608)

# АД ДЗВІНЫ ДА АКІЯНА. МАГІЧНЫЯ ЛІЧБЫ НАВУМА ГАЛЬПЯРОВІЧА

**У гэтым студзені ў паэта, пісьменніка, журналіста, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь Навума Гальпяровіча — юбілей. Наша размова атрымалася не зусім звычайная, але падпарадкаваная магіі лічбаў.**

**1. Тры самыя запамінальныя матэрыялы, якія Навум Гальпяровіч зрабіў у якасці журналіста. Аповед вядзецца ад першай асобы**



## САЛАМЯНЫЯ БРЫЛІ

Адну з першых сваіх журналісцкіх паездак я зрабіў на Браслаўшчыну.

Мой гід Кастусь, супрацоўнік мясцовага музея, аказаўся вельмі цікавым суразмоўцам.

— Паедзем у Слабодку, — прапанаваў Кастусь. — Там жывуць цудоўныя майстры, якіх вы яшчэ не бачылі.

Да гэтага я пацікавіўся цудоўнымі расфарбаванымі скульптурнымі кампазіцыямі, зробленымі з дрэва: святы Юр'я забівае змея, багаты шляхцюк з пышнымі вусамі з шабляй едзе на кані...

— Гэта Пятро Зяляўскі са Слабодкі, — заўважыў Кастусь. — Вырабы са звычайнага палена. Між тым у Парыжы на выставе пабывалі...

Слабодка аказалася вялікай вёскай на беразе возера, з магутным чырвоным касцёлам у цэнтры. Напачатку мы зайшлі да мясцовага народнага майстра Пятра Карэніка. Даволі моцны яшчэ дзядуля плёў брыль з саломы. На цвіку вісеў ужо гатовы — адмысловы, такі прыгожы, які толькі на карцінках я раней бачыў.

— Вось мастакі з Мінска, што адпачываюць на Браслаўскіх азёрах, заказваюць такія брылі, — сказаў Кастусь.

Пасля таго майго рэпартажу слава пра майстра са Слабодкі хутка абляцела Беларусь, і ўжо ўся сям'я дзеда ўключылася ў работу, столькі пасыпалася заказаў адусюль. Аказалася, што дзедава майстэрства — выдатны бізнес і прыносіць зусім нядрэнны даход.

Цяпер, калі я бачу на сцэне народныя калектывы, здымкі ў часопісах, на якіх красуюцца беларусы ў саламяных брылях, успамінаю дзеда са Слабодкі, які з маёй лёгкай рукі стаў адным з тых, хто адрадзіў для сучаснікаў адзін з відаў нацыянальнага мастацтва, унесенага нядаўна ў спіс ЮНЕСКА.

## ЯБЛЫК СТАГОДДЗЯ

Запомніўся рэпартаж з вёскі Алашкі Шаркаўшчынскага раёна пра Івана Сікору, садавода, які вывеў сорт яблыка, што ў 1939 годзе на выставе ў Рыме атрымаў першы прыз. З Іванам Сікорам перапісваўся Леў Талстой, вершы яму прысвячаў Максім Танк. Пра сад, у якім эксперыментаваў селекцыянер, мне расказаў мой калега Герман Кірылаў з «Полацкай газеты». Мы хадзілі па гэтым садзе, і сын славутага садавода Віктар Іванавіч распавядаў пра свайго бацьку. На жаль, усё прыходзіла ў запусценне без гаспадара, давялося ўздымаць пытанне пра дастойнае ўшанаванне імя Івана Паўлавіча Сікоры. Цяпер у Алашках музей, адноўлены сад, але, каб гэта адбылося, прыйшлося не раз вяртацца да тэмы.

## ДУДАРАЎ І ЖЫЦЦЁ

Цікавай атрымалася гутарка ў праграме «Суразмоўцы» з драматургам Аляксеем Дударавым. Па яго ініцыятыве мы адкінулі падчас размовы ўсе мае папярэднія нарыхтоўкі і проста пагаварылі пра жыццё, пра бацькоў, пра яго творы, пра крыніцы творчасці, нават крыху падыскутавалі.

Ды такіх цікавых сустрэч і гаворак было за амаль сорак гадоў журналісцкай працы нямала.

**2. Тры самыя ўлюбёныя месцы роднага Полацка**

## СПАС НАД ПАЛАТОЙ

Канечне, цэркаўка Спаса над Палатой. Масток праз рачулку, калі з таго берага яна праз зяляніну дрэў свеціцца, нібыта чароўная свечачка. Мне давялося жыць у дзяцінстве побач і амаль кожны дзень праходзіць праз браму манастыра, і яго заняпад і адраджэнне адбываліся на маіх вачах.

## АДХОН НАД ДЗВІНОЙ

Высокая строма каля Сафійскага сабора, з якой відаць, як маленькая вірлівая Палата ўпадае ў паўнаводную Дзвіну... Кожны раз я імкнуся хоць на некалькі хвілін пастаяць на самым краі стромы і палюбавацца гэтай прыгажосцю. А потым спусціцца на падвесны масток, што злучае гэтую частку горада з Запалоццем — былым гарадзішчам, дзе некалі быў старажытны Полацк.

## ВІД НА ЧЫРВОНЫ МОСТ

Люблю вулачку Стралецкую, што акружае Вал Івана Грознага і Верхні горад. Адсюль з вышыні можна палюбавацца на Чырвоны мост і сучасную вуліцу, што вядзе да цэнтральнай плошчы горада.

**3. Тры самыя цікавыя падарожжы**

## УЗЫХОДЖАННЕ НА ПАМІР

Ніколі не забудуся пра падарожжа ў Душанбэ, куды лётаў у маладосці «дзікуном» да сябра дзяцінства, які пэўны час жыў там з маладой жонкай, якая трапіла па размеркаванні працаваць на мясцовую панчошную фабрыку. Там удалося зрабіць уздым на адну з гор Паміра, пакупацца ў возеры ў трыццаціградусную спякоту ў пачатку красавіка, бачыць размаіты і тлумны ўсходні базар.

## ПАРТУГАЛІЯ, АКІЯН І ПАРТВЕЙН

Запомніўся горад Порту на беразе Атлантычнага акіяна, дзе правёў некалькі дзён у камандзіроўцы. Прырода, вузкія вулачкі горада, вінныя падвалы завода Партвейна, дзе захоўваецца віно XVII стагоддзя...

## КІТАЙСКАЯ СЦЯНА

І, канечне, незабыўныя ўражанні — падарожжа па Кітаі. Пекін, Вялікая Кітайская сцяна, Шанхай, горад Цюйфу — радзіма Канфуцыя, гара Тайшань...

**4. Трое творцаў, якія зрабілі найбольшы ўплыў**

Не буду тлумачыць, чаму кожны з гэтых творцаў мне дарагі, — проста пералічу: Уладзімір Караткевіч, Арсеній Таркоўскі, Міхась Стральцоў.

**5. Тры самыя дарагія паэту вершы**

## ПРА ВЕЧНАГА ВУЧНЯ

* * *

*Я — вучань. Птушкі пішуць мне*
*У тонкі сшытак даўнія імёны.*
*Я ведаю замовы і праклёны,*
*Я чую, як гавораць дождж і снег.*
*Я — вучань. Мне настаўнік загадаў*

*Вучыць на памяць рэкі, хмары, дрэвы,*
*Імжу і слоту, сонца і залевы,*
*І кроплі свет, адкуль пайшла вада...*

Гэта ў нечым праграмны верш. Нарадзіўся ён таксама, як многія іншыя, спантанна, без усялякіх папярэдніх нарыхтовак. Проста стаў, відаць, плёнам маіх думак і стаўлення да ўласнай творчасці. Да гэтага часу адчуваю сябе вучнем, і страшна, што не вывучыў урока. Дарэчы, гэты верш вельмі падабаўся Алесю Разанаву, ён часта цытаваў яго і казаў, што мой радок пра нявывучаны ўрок датычыцца ўсяго чалавецтва.

## ПРА ПОЛАЦК

* * *

*Веі замружу, і ўбачыцца вечар —*
*Белая цэркаўка тоненькай свечкай.*
*Гнёзды шпачыныя над Палатой.*
*Цені дубоў над халоднай вадой.*

*А за стагоддзямі ў прыцемку сінім*
*Вочы зямлячкі маёй, Еўфрасінні.*
*Цьмяна бялее на кнізе рука,*
*Б'ецца аб шыбу агонь матылька...*

Ну, тут усё зразумела. Не мог не нарадзіцца такі верш, калі нябачны позірк Еўфрасінні я адчуваў побач з уласнай хатай, праз браму манастыра за сто метраў ад весніц, праз якія я выходзіў штодня на вуліцу, што сёння носіць імя полацкай асветніцы.

## ПРА ВОСЕНЬ

* * *

*Лістапад — гэта месяц такі*
*Паміж будучым і мінулым.*
*Зноў разлогі туга разгарнула,*
*Вее сіверам з ціхай ракі.*

*Голлем чорным ашчэрыўся сад,*
*Што застаўся сам-насам з залевай.*
*Лістапад,*
*лістапад,*
*лістапад*
*Над зямлёй плыве набалелай...*

Адну са сваіх кніжак я назваў «Час лістападу». Сапраўды, увосень думаецца пра ўласны лёс, лёс блізкіх, Радзімы. Так вось — паміж будучым і мінулым.

**Падрыхтавала Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# ЯК ТРАПІЦЬ У ТОП БЕЛАРУСКІХ КНІЖНЫХ ПРОДАЖАЎ?

**Чытачы цяпер розныя, але трымаць з імі сувязь — асноўная задача тых, хто сёння стварае кнігі на розных узроўнях. Дзеля гэтага ў Беларусі існуе сетка кнігарань, якая імкнецца наладзіць больш шырокія стасункі з аўдыторыяй. У тым ліку з дапамогай сучасных тэхналогій. Пра гэта ішла гаворка на прэс-канферэнцыі, прысвечанай перспектывам развіцця дзяржаўнай гандлёвай сеткі «Белкніга» і наогул прасоўванню беларускай кнігі.**

— Сёння мы дастаткова актыўна развіваемся як рознічная сетка, — засведчыў **Уладзімір МАТУСЕВІЧ, генеральны дырэктар гандлёвай сеткі «Белкніга»**. — У нас 86 крам, чатыры агульныя гандлёвыя аб'екты. Ёсць нават літаратурная кавярня, якая знаходзіцца ў кнігарні «Светач». Агульная выручка за 2022 год перавысіла 51 мільён. Па папярэдніх даных, ёсць рост тавараабароту ў параўнанні з мінулым годам, таму і перспектывы. Мы бачым, што цікавасць да чытання назіраецца ў тым ліку ў маладых людзей, якія таксама з'яўляюцца наведвальнікамі нашых кнігарань, купляюць кнігі, чытаюць іх. Таму кніга — не столькі тавар, колькі з'ява ў культурным жыцці краіны.

**Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі**, звярнуў увагу на сумесныя з «Белкнігай» клопаты па прапагандзе чытання:

— Сапраўды, сёння выдавецтвы не могуць існаваць без адраснага кніжнага гандлю. Кніга не стане вядомай, калі яе не прапагандаваць. Таму тыя аўтары, якія з'яўляюцца сябрамі Саюза пісьменнікаў Беларусі, кнігі якіх выпускае Выдавецкі дом «Звязда», вельмі актыўныя ў супрацы з кнігарнямі «Белкнігі», дзе адбываюцца традыцыйныя аўтограф-сесіі і прэзентацыі. Але трэба сказаць, што ў апошнія гады нетрадыцыйнымі сталі падыходы да арганізацыі прэзентацый і аўтограф-сесій. Мы вельмі ўдзячныя «Белкнізе» і Міністэрству інфармацыі за кнігарню «Светач» — гэта сучасная пляцоўка, дзе можна арганізоўваць выступленні, збіраць шырокую аўдыторыю. Калі гаварыць пра кнігі, выдадзеныя ў «Звяздзе», то нядаўна мы прэзентавалі раман расійскага пісьменніка Мікалая Чаркашына «Брэсцкая брама» і бачылі, што ўвага чытачоў была вялікая, і гэта, відаць, уплывае на продажы кнігі. Вельмі часта на пляцоўку «Светач» і іншых кнігарань «Белкнігі» прыходзяць дзіцячыя пісьменнікі — сёння выразны ўсплёск дзіцячай літаратуры. Калі мы гаворым пра пошук добрай мастацкай кнігі ўвогуле, то ў дачыненні да дзіцячай літаратуры ён як правіла атрымаецца паспяховым: ёсць што выбраць на розныя густы. Гэта залежыць яшчэ ад таго, як кніга выстаўлена на паліцах. Вельмі прыемна, што супрацоўнікі «Белкнігі» гэта ўлічваюць, падбіраюць кнігі беларускіх выдавецтваў і адзначаюць найлепшыя па афармленні, адрасаваныя юным чытачам.

Як адзначыў Уладзімір Матусевіч, у кніжным абароце прыкладна 70 працэнтаў займае беларуская кніга, выдадзеная айчыннымі выдавецтвамі. Кнігі ў Беларусі закупляюць не толькі асобныя чытачы, але і бібліятэкі. Паводле досведу Выдавецкага дома «Звязда», гэта адбываецца даволі сістэматызавана. У бюджэце адзначаецца, на якую суму павінны быць запланаваны сродкі на закупку кніг для школьных бібліятэк і публічных бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры Беларусі (а гэта бібліятэкі і ў раённых цэнтрах, і ў пасёлках гарадскога тыпу, аграгарадках) — сур'ёзныя лічбы, як адзначае Аляксандр Карлюкевіч, з улікам таго, што кнігі сёння не танныя. Бібліятэкі ў меншай ступені маюць справу з кнігарнямі «Белкнігі», а працуюць непасрэдна з сеткай дзяржаўных выдавецтваў.

— Попыт на беларускую літаратуру насамрэч ёсць, калі паглядзець на топ-продажаў «Белкнігі», — тлумачыць Уладзімір Матусевіч. — На першых радках, вядома, — вучэбная літаратура, бо ёсць пэўны запыт з боку навучальнага працэсу. Але сярод кніг мастацкай літаратуры на першых пазіцыях — менавіта беларускія аўтары. Тут у абсалютным топе — Караткевіч: «Дзікае паляванне караля Стаха» (найбольшыя тыражы па продажы за мінулы год), «Каласы пад сярпом тваім», іншыя яго творы. Далей ідуць класікі — Іван Шамякін, Іван Мележ (таксама можна ўгледзець сувязь з адукацыйным працэсам), «Палескія рабінзоны» Янкі Маўра.

У наш час сучасныя тэхналогіі дазваляюць не згубіць сувязь з маладой і нават дзіцячай чытацкай аўдыторыяй. Дзеля гэтага створаўся анлайн-праект «Чытанка», які рэалізоўваюць сумесна «Белкніга», Саюз пісьменнікаў Беларусі, Міністэрства інфармацыі. «Белкніга» — найперш сетка кнігарань, арыентаваная на рэалізацыю папяровых выданняў, але анлайн-гандаль дэманструе рост у два разы за мінулы год у параўнанні з папярэднім. Гэтая праца будзе ўдасканальвацца ў тым ліку ў частцы больш хуткай дастаўкі кніг чытачу праз супрацоўніцтва з «Белпоштай».

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Высокае мастацтва

# ЭЛІКСІР ДЛЯ ДАЎГАЛЕЦЦЯ

## У Брэсце прайшоў фестываль «Студзеньскія музычныя вечары»

**Пачатак года ў Брэсце ўжо даўно асацыіруецца з фестывалем «Студзеньскія музычныя вечары». Быў час, калі оперныя дзівы прыбывалі да нас у гэтую пару ў раскошных футрах, бо стаяла сапраўдная зіма. Цяпер пейзажы іншыя — ні намёку на снег альбо мароз, а аркестр каля акадэмічнага тэатра ў дзень адкрыцця іграе пад дробным дажджом. Што ж, зімы няма, а фестываль ёсць — на радасць аматарам высокага мастацтва.**

Напачатку тыдня Міжнародны фестываль класічнай музыкі «Студзеньскія музычныя вечары» адкрыў заслону 35-ы раз. На гэты раз у «Вечарах» прынялі ўдзел музыканты і выканаўцы з Беларусі, Балгарыі, Босніі, Грузіі, Італіі, Расіі, Сербіі і Сірыі. Як заўсёды, цырымонія ўрачыстага адкрыцця адбылася ў Акадэмічным тэатры драмы.

У прывітальным слове **намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім КРАЎЧУК** адзначыў, што фестываль даўно стаў не толькі брэндам Брэста і рэгіёна, але і нашай краіны. «Сюды прыязджаюць сусветна вядомыя спевакі і музыканты, некаторыя пабывалі ўжо шмат разоў. І ўсё дзякуючы непаўторнай атмасферы фестывалю, якую стварыла ад самага пачатку заслужаны дзеяч мастацтваў Лілія Батырава», — сказаў Вадзім Краўчук. Пад апладысменты залы Ліліі Рыгораўне перадалі букет ад імя старшыні аблвыканкама Юрыя Шулейкі.

І калі «Вечары» можна назваць брэндам рэгіёна, то брэндам фестывалю, несумненна, з'яўляецца яго заснавальнік, дырэктар, галоўны рэжысёр, лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За развіццё міжнародных культурных сувязяў» Лілія Батырава. Лілія Рыгораўна некалькі гадоў таму адзначала 85-годдзе, але па-ранейшаму з'яўляецца душой фестывалю, яе ведаюць і любяць артысты, здаецца, з усяго свету, на яе запрашэнні адгукаюцца і прыязджаюць падарыць брастаўчанам незабыўнае свята высокай музыкі.

Як заўсёды, асабліва хвалюючым становіцца вечар-адкрыццё. Праграму першага вечара сёлета адкрыў Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам дырыжора і мастацкага кіраўніка, народнага артыста Беларусі Аляксандра Анісімава. Прагучала ўверцюра да оперы Вагнера «Нюрнбергскія мейстэрзінгеры» і ўверцюра да оперы Глінкі «Руслан і Людміла». Разам з народным артыстам Беларусі прафесарам Ігарам Алоўнікавым музыканты выканалі першую частку фартэпіяннага канцэрта Чайкоўскага.


Фота Валерыя КАРАЛЯ.
Дамінга СТАСІ і Расана ПАТЭНЦА.

Слухачы цёпла прымалі італьянскіх гасцей — салістку італьянскай оперы Расану Патэнца і саліста оперных тэатраў Дамінга Стасі, а таксама першую флейту оперных тэатраў Мілана і Рыма Антонія Амендуні. Ганна Саўкіна з Санкт-Пецярбурга выканала канцэрт для скрыпкі з беларускім аркестрам і была ўзнагароджана бурнымі апладысментамі.

Італьянскія выканаўцы спявалі і паасобку, і дуэтам — цудоўнае сапрана Расаны з тэнарам Дамінга стварала чаканую атмасферу, слухачы ўсміхаліся, зараджаліся энергіяй музыкі. А калі аб'явілі арыю «Заздароўную» з оперы Вердзі «Травіята», і Дамінга Стасі адкрыў бутэльку шампанскага, зала адгукнулася адабральным гулам, цалкам запанаваў святочны настрой.

Адным з найбольш чаканых аматарамі фэсту было выступленне тэатра «Маскоўская аперэта». Загадкавы містэр Ікс у выкананні Паўла Іванова, несумненна, пакарыў публіку. Марыя Варажэйкіна ў ролі Тэдоры таксама была чароўнай. Адным словам, спатканне з творам Імрэ Кальмана, правільней сказаць, спектаклем у дзвюх дзеях, атрымалася надзвычай цёплым, пранікнёным.

У трэці дзень «Вечароў» па традыцыі прайшоў калядны баль у тэатры драмы. Гэты баль не мае жорсткіх патрабаванняў да дрэс-коду, таму аматараў класічных танцаў прыйшло нямала. У вальсе і танга прыгожа кружылі пары ў тым ліку трэцяга ўзросту.

Адметнасцю сёлетняга фестывалю назвалі дабрачынны канцэрт для медыцынскіх работнікаў Брэста і Брэсцкага раёна. Як заявілі арганізатары, мерапрыемства стала знакам увагі да прадстаўнікоў самай гуманнай прафесіі, да людзей, якія працуюць у выхадныя і святы. Усяго было раздадзена каля 400 запрашальных білетаў. І зала Брэсцкага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Р. Шырмы ўвечары 11-га аказалася поўная.

У кулуарах фестывалю артысты дзяліліся ўражаннямі з журналістамі. **Маэстра Аляксандр АНІСІМАЎ** пахваліў брэсцкую публіку:

— Прыемна бачыць у зале людзей, якія з году ў год прыходзяць на канцэрты «Вечароў». Ведаю, што некаторыя з іх даязджаюць не толькі ў Мінск, але нават у Маскву і Піцер, каб сустрэцца з высокім мастацтвам. Мы рады выступаць у Брэсце, шчаслівыя сустрэчамі з сапраўднымі аматарамі класічнай музыкі.

Улюбёнец брэсцкай публікі італьянскі **флейтыст Антонія АМЕНДУНІ** сказаў так:

— Мне прыемна зноў вярнуцца ў Брэст, дарэчы, сёмы раз выступаю на «Вечарах». Упершыню прыехаў сюды 15 гадоў таму. Для мяне ваш горад ужо крыху родны. Публіка тут цудоўная. Прыемна паслухаць іншых выканаўцаў. Я ўдзячны спадарыні Ліліі і ўсім арганізатарам фестывалю за запрашэнне і добрую арганізацыю.

**Скрыпачка Ганна САЎКІНА** — таксама даўні сябар фестывалю, яна прыязджае ў Брэст сёмы раз:

— Я палюбіла Брэст за цёплыя сустрэчы, за добрую атмасферу. Гэта цудоўна, што фестываль праходзіць штогод і збірае артыстаў вельмі высокага ўзроўню. Таму ў сваім даволі шчыльным канцэртным графіку заўсёды знаходжу акенца для «Вечароў». З многімі калегамі-інструменталістамі пазнаёмілася менавіта тут, з некаторымі працягваем стасункі, абменьваемся інфармацыяй, творчым вопытам. Рада выступаць з беларускім дзяржаўным акадэмічным аркестрам пад кіраўніцтвам маэстра Анісімава. Музыканты цудоўна іграюць.

Напрыканцы парада ад Ліліі Батыравай: «Любіце музыку, адчувайце яе. Хто слухае класічную музыку, жыве доўга».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

З нагоды

# НАТХНЕННЕ З ГІСТОРЫЯЙ

## Пад знакам 85-годдзя Беларускага саюза мастакоў

**Гэтая юбілейная дата так ці інакш паўплывае на ўсе выставачныя планы ў Беларусі, адзначыў старшыня Беларускага саюза мастакоў Глеб ОТЧЫК. Пры тым што будуць яшчэ і асобныя юбілеі, якія немагчыма прапусціць. А некаторыя даты адна другую ўзмацняюць і памнажаюцца на агульнае жаданне творцаў выстаўляцца.**

І вось першая знакавая для беларускіх мастакоў выстаўка юбілейнага года: 12 студзеня ў Новай Траццякоўцы ў Маскве адкрылася выстаўка, у якой бяруць удзел сябры двух творчых суполак — Беларускага саюза мастакоў і Саюза мастакоў Расіі. Гэта другое прадстаўленне беларускіх мастакоў у Новай Траццякоўцы, першае адбылося ў рамках Дзён культуры Беларусі ў Маскве напрыканцы мінулага года. Менавіта пасля гэтага нарадзіўся новы праект і жаданне паказаць беларускіх мастакоў на прэстыжнай пляцоўцы, якая з'яўляецца адным з найлепшых музеяў свету.

Але не менш важнае жаданне паказаць сябе і на радзіме, што выяўляецца ў вялікай колькасці буйных імпрэз, якія часам падобныя на мастацкія фестывалі для рознай публікі. І нават у розных гарадах краіны. Гэта магчыма дзякуючы таму, што ў Саюзе мастакоў сабрана вялікая калекцыя жывапісу, графікі і скульптуры, якая будзе курсіраваць па гарадах.

Фестывалі — наогул цікава, і нездарма іх становіцца больш: ёсць магчымасць ахапіць мастацтвам і ўвесь горад Мінск, і краіну наогул. І падкрэсліць, што творцы жывуць не толькі ў сталіцы, але і ў розных кутках краіны, і ўсе вартыя ўвагі і могуць мець сваю аўдыторыю. А кожны глядач атрымае магчымасць пазнаёміцца з любімым мастаком і нават завітаць да яго ў майстэрню падчас Дня адкрытых дзвярэй (у адным Мінску 252 майстэрні ва ўласнасці Саюза мастакоў і 112 арандуюцца ў горада!). У 85-годдзе мастакі задзейнічаюць усе магчымыя лакацыі.

— Сёлета адбудуцца розныя мастацкія праекты, але ўсе яны паяднаныя адзінай ніццю, паколькі мы святкуем 85 гадоў саюза мастакоў, — адзначыла **першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля ШАРАНГОВІЧ**. — Творчая арганізацыя перажыла шмат рэфармаванняў, якія былі звязаныя з рознымі гістарычнымі перыядамі. Але праз яе прайшлі яркія асобы выяўленчага мастацтва, якімі мы ўсе ганарымся. У нас ёсць тыя, чыю рэтраспекцыю мы можам паказаць (напрыклад Віталя Цвіркі). У нас сёлета 100-годдзе Леаніда Шчамялёва, вартае прысвячэння. Але ў нас ёсць і цудоўныя сучасныя мастакі. Мы можам завязаць і гістарычны, і сучасны кантэкст у сваіх праектах.

У Беларускім саюзе мастакоў на цяперашні момант 13 секцый, сябры якіх так ці інакш стануць удзельнікамі запланаваных выставак. Для кожнай секцыі будзе нагода сябе паказаць. Ужо напрыканцы сакавіка адбудзецца праект «Кабінет графікі», аб'яднаны з традыцыйнай выстаўкай «Графіка года», прысвечаны работам, якія ствараліся ў 2022 годзе. Такім чынам ёсць жаданне падкрэсліць, што беларуская школа графікі — адна з наймацнейшых у Еўропе і працягвае заставацца такой жа прафесійнай, як і шмат гадоў таму. Графіка з музейных калекцый будзе суседнічаць з сучаснымі творамі.

Фестываль сучаснага манументальнага мастацтва «Манумент-23» будзе змяшчаць адсылкі да гістарычных манументальных аб'ектаў, на якіх апошнія два гады працавалі сябры секцыі манументалісты. Але ў той жа час яны пакажуць манументальны жывапіс. Не забудуць пра юбілеі вядомых мастакоў-манументалістаў. Аляксандру Кішчанку сёлета споўнілася б 90 гадоў. Гаўрыла Вашчанка хоць і займаўся больш жывапісам, але стварыў кафедру манументальнага мастацтва і шмат гадоў ёю кіраваў. Яму сёлета споўнілася б 95 гадоў. Зоя Літвінава апошнія гады таксама больш займаецца жывапісам, але працуе з манументальнымі роспісамі. Ёй прысвецяць асобны праект.

Асаблівая нагода сёлета — прадставіць мастакоў, якія займаюцца эксперыментальнымі формамі мастацтва. Хоць летась узнікла новае трыенале канцэптуальнага мастацтва «Канцэпт» і яно будзе паўтарацца, але як абысці знакавую дату — 110 гадоў стварэння «Чорнага квадрата» Казіміра Малевіча? Ён меў дачыненне да Віцебска, і ў наш час там жывуць мастакі, якія лічаць сябе паслядоўнікамі Малевіча. У свой час там была створана суполка пад назвай «Квадрат» — гэта цікавая форма сведчыць аб тым, што ў мастацтве адбываюцца змены. Вось і паглядзім, якія гэта змены, на рэспубліканскай выстаўцы. На ёй будзе магчымасць убачыць сучасныя эксперыменты віцебскіх мастакоў, адзін з якіх — Васіль Васільеў — заснаваў праект «Абстракт». А цяпер праз форму квадрата можна будзе аб'яднаць мастакоў з розных гарадоў і нават секцый.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Рэха падзеі

# ТВОРЧЫЯ АГНІ ВІЦЕБСКА

**Адгучалі святочныя акорды IV Міжнароднага фестывалю-конкурсу «Арт-парад у Віцебску», які сёлета сабраў звыш тысячы ўдзельнікаў з 16 краін свету. Харэаграфічны Гран-пры застаўся ў горадзе на Дзвіне, а вакальны — паехаў у Арменію.**


Марыца ЦІЛІКЯН.

Чацвёрты раз Віцебск расчыніў свае дзверы для ўдзельнікаў і гасцей зімовага «Славянскага базару» — так міжнародны конкурс «Арт-парад» празвалі арганізатары. Фестываль і сапраўды стаў зімовым творчым вогнішчам для ўсіх аматараў і прафесіяналаў вакальнага і харэаграфічнага мастацтва. Гісторыя «Арт-парада» пакуль яшчэ не такая вялікая, як у летняй «славянкі», але фестываль ужо карыстаецца папулярнасцю ў творчым міжнародным асяроддзі. Пацвярджэннем гэтага факта з'яўляюцца ўдзельнікі з больш чым паўтара дзясятка краін, некаторыя з якіх асабіста прыехалі на галоўную віцебскую сцэну, бо сёлета конкурс праходзіў афлайн і анлайн.

— Канкурсанты з дзевяці краін выступалі на сцэне, яшчэ з сямі — прыехаць не змаглі, таму даслалі відэазапісы сваіх выступленняў. Прадстаўлены краіны СНД, Егіпет, Ізраіль, Кітай. Толькі з Расіі ў фестывалі ўзялі ўдзел прадстаўнікі больш як з 10 рэгіёнаў: гэта і Масква, і Калінінград, і Сібір, — расказаў **дырэктар Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», генеральны дырэктар ДУ «Цэнтр культуры «Віцебск» Глеб ЛАПІЦКІ**.

На гала-канцэрце, які стаў фінальным акордам «Арт-парада», артысты прадставілі на суд журы найлепшыя нумары, якія былі адабраны па выніках вочнага тура. Лаўрэаты першай ступені змагаліся за два Гран-пры ў вакальнай і харэаграфічнай намінацыях. На самую высокую прыступку падняліся спявачкі з Беларусі і Арменіі, аднак пранізлівая «Балада аб маці» пераважыла чашу шаляў у бок Марыцы Цілікян — галоўны прыз у намінацыі «Вакал» адправіўся ў Арменію.

У харэаграфічнай намінацыі перамаглі віцябчане — народны тэатр-студыя сучаснай харэаграфіі пад кіраўніцтвам Дзіяны Юрчанкі. Аднак танцоры гэтага калектыву ўжо былі заяўлены як удзельнікі ў будучым фестывалі мастацтваў у горадзе на Дзвіне, таму свой шчаслівы квіток на «Славянскі базар» падарылі ўзорнаму ансамблю танца «Натхненне» (Беларусь).

«Арт-парад у Віцебску» — не толькі творчая, але і адукацыйная пляцоўка. Добрай традыцыяй на працягу чатырох гадоў з'яўляецца правядзенне майстар-класаў ад вядомых дзеячаў культуры і мастацтва. Сёлета сакрэтамі вакальнага майстэрства з удзельнікамі фестывалю падзяліліся грузінская спявачка, педагог акадэміі Ларысы Долінай Этэры Берыяшвілі і латвійская спявачка Яна Клявіня. А танцоры наведалі майстар-класы педагога-харэографа заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь Тэатра танца «ALEXIS» Аляксандра Зенчанкі і заслужанай артысткі Расіі Марыі Валодзінай.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Строитель-197», г. Молодечно

| Лот | Наименование лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Мотобур ВТ 360 | 630,00 | 63,00 | 31,50 |
| 2 | Станок 8Г | 720,00 | 72,00 | 36,00 |
| 3 | Станок СМЖ | 210,00 | 21,00 | 10,50 |
| 4 | Пресс-ножницы | 1050,00 | 105,00 | 52,50 |
| 5 | Вагон-бытовка строительная | 294,00 | 29,40 | 14,70 |
| 6 | Вагон-бытовка строительная | 420,00 | 42,00 | 21,00 |
| 7 | Вышка строительная сборно-разборная передвижная ВСРП-2500-20 | 270,00 | 27,00 | 13,50 |
| 8 | Компьютеры согласно списку 1: https://docs.google.com/document/d/1JzbpKeJTzQE4Z9CrgAdLod5NMS7Vcahx/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 513,47 | 51,35 | 25,67 |
| 9 | Кап. строение (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – одноэтажное кирпичное здание конторы) с инв. № 630/С-39007 общей площадью 335,3 кв. м, с составными частями и принадлежностями (три навеса); система пожарной сигнализации; мебель согласно списку 2: https://docs.google.com/document/d/1JfGDgll07rVeKKkVpMHVTxKuAb91IAXi/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 68778,67 | 6877,87 | 3438,93 |
| 10 | Оборудование согласно списку 3: https://docs.google.com/document/d/1EuWvjcW5KZJsl4iM5STLhFMh1QlXcAww/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 2806,61 | 280,66 | 140,33 |
| 11 | Кап. строение (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – двухэтажное кирпичное здание базы) с инв. № 630/С-38998 общей площадью 870,5 кв. м; мебель согласно списку 4: https://docs.google.com/document/d/1OuPLBa0AxoC8WSqv1QTePYtLqxJ8zovu/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 97155,65 | 9715,57 | 4857,78 |
| 12 | Леса, согласно списку 5: https://docs.google.com/document/d/1iSG4vAz0k2sOJeXe0-m-dfrqv0ut7Zzn/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 888,81 | 88,88 | 44,44 |
| 13 | Столы каменщика согласно списку 6: https://docs.google.com/document/d/1uHq2x5x-ZPq_zi6MhDw0uroMSM5E8Pzb/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 795,00 | 79,50 | 39,75 |

В отношении лотов №№ 1–13 проводятся восьмые повторные торги.
**В отношении лотов № 9 и № 11 стоимость снижена на 70 %.**
**В отношении лотов №№ 1–8, 10, 12, 13 стоимость снижена на 75 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 110 (29732) от 08.06.2022, № 138 (29760) от 16.07.2022, стр. 7, № 159 (29781) от 16.08.2022, № 175 (29797) от 07.09.2022, стр. 6, № 194 (29816) от 04.10.2022, стр. 14, № 214 (29836) от 01.11.2022, стр. 15, № 233 (29855) от 26.11.2022, стр. 10, № 248 (29870) от 17.12.2022, стр. 6

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **27 января 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | **с 10.00 16.01.2023 до 16.00 25.01.2023** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Местонахождение имущества** | Минская область, г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1 |
| **Земельный участок** | Лоты № 9 и № 11 расположены на земельном участке с кадастровым № 642000000003000670 площадью 0,8586 га (74/100 доли) для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственной базы по ул. Металлистов, 1 в г. Молодечно. Право аренды |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по лоту __, ОАО «Строитель-197», г. Молодечно, проводимых 27.01.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лотам №№ 1–8, 10, 12, 13 составляет 7 % от конечной цены предмета торгов; по лотам №№ 9, 11 составляет 5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться к Татьяне Степановне (+375291877401).** По вопросу наличия обременений обращаться к Артуру, тел. +375293396845. **Дополнительная информация по лотам №№ 1–8, 10, 12, 13 по тел. +375293042560, Андрей, по лотам №№ 9, 11 – по тел. +375293082762, Екатерина.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет. Государственная регистрация договора купли-продажи транспортных средств и снятие их с государственного учета осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **ОАО «Строитель-197», г. Молодечно (Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1) в лице ликвидатора ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 (29) 339-68-45 (Артур)** |

---

БЕЛАРУСБАНК

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта** | **Изолированное помещение № 111/D-4442 (гараж)** |
| **Место-расположение объекта** | Брестская область, г. Ляховичи, ул. Минская, 10-1 |
| **Продавец объекта** | ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| **Организатор торгов** | Брестское областное управление № 100 ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| **Площадь** | 21,4 кв. м |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС** | 3 360,00 руб. (три тысячи триста шестьдесят руб. 00 коп.) |
| **Сумма задатка** | 336,00 руб. (триста тридцать шесть руб. 00 коп.) |
| **Информация о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым № 125050100001000917, с площадью 0,0546 га |
| **Характеристика объекта** | Стены – блочные, облицованы кирпичем, перекрытие – плиты железобетонные, пол – бетонный, ворота металлические, крыша (кровля) – рулонные кровельные материалы, электроснабжение |
| **Условия оплаты** | По договоренности победителя аукциона с собственником имущества |

Аукцион состоится **20 февраля 2023 года в 10.00** по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, актовый зал на 9-м этаже.

Документы для участия в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, каб. 409. до 16.00 17.02.2023 года.

Для участия в аукционе к моменту подачи документов необходимо внести задаток на р/с **BY69AKBB66708597000020000000**, ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНН 100325912.

